Валянцін Болтач



...усё зробленае табой добрае і благое
працягвае жыць роўна столькі,
наколькі зафіксавалася ў нечай памяці,
колькі застаецца запатрабаваным людзьмі...

# Уваскрасеньне ўчарашняга дня

## *Лірычна-дакументальны расповяд*

*Унуку Валянціну прысьвячаю...*

***У гэтым расповедзе, які прадстаўляю чытачам “Дзеяслова, у значным скароце, няма літаратурных герояў, прыдуманых ці дадуманых фактаў – тут толькі тое, што было ці адбывалася, што ведаў, бачыў на свае вочы, чуў на свае вушы, альбо ўведаў з дакументаў ці вартых даверу крыніцаў...***

***А ўвогуле задумаешся іншы раз – і аж атарапеньне бярэ: за нейкіх-нейкіх пяцьдзесят аблётаў Зямлі вакол Сонца гэтак неўпрыкмет, незаўважна памянялася ўсё да непазнавальнасьці – і жывое, і нежывое, нават тое, што падавалася вечным і непарушным, непадуладным часу. Мусіць, толькі на схіле жыцьця дадзена так яскрава, амаль фізічна адчуваць хуткаплыннасьць і няўмольны бег Часу, ягоную шчымліва-балючую незваротнасьць, выразна і абвострана спасьцігаць невясёлую ісьціну: як не кожнаму зярнятку наканавана***

*Часопісны варыянт.*

***ўзрасьці коласам, так і ня кожнай справе рук тваіх даць плён. І прыходзіць разуменьне: усё зробленае табой добрае і благое працягвае жыць роўна столькі, наколькі зафіксавалася ў нечай памяці, колькі застаецца запатрабаваным людзьмі...***

***Лёс наканаваў майму пакаленьню рэдкую магчымасьць жыць на зломе эпох, пераступіць мяжу, лінію перамены ня толькі стагоддзяў, а і тысячагоддзяў, быць сьведкам і ўдзельнікам лёсавызначальных падзеяў, тэктанічных зрухаў у сьвядомасьці і сацыяльным быцьці грамадства. На пакручастых жыцьцёвых дарогах і сьцяжынках мне пашчасьціла знацца і сустракацца, супрацоўнічаць і апаніраваць, таварышаваць і сябраваць з цікавымі, унікальнымі людзьмі – і простымі, непрыкметнымі, нават дзівакаватымі, што, на першы погляд, апроч зарубачак у нечай памяці, нічога не пакінулі пасьля сябе, і асобамі, якія на дзесяцігоддзі, а мо нават і стагоддзі змусяць гаварыць пра сябе, застануцца ў аналах гісторыі, ход якой ува многім і прадвызначалі. Перад вамі – не мемуары ў звыклым разуменьні. Гэта – шчыры лірычны расповед, у нечым споведзь перад сабою і людзьмі з асэнсаваньнем бачанага, чутага,што некалі пройшло праз сэрца і розум, калі хочаце – спроба вярнуцца, віртуальна ўваскрасіць мінулае. Словам, пражытае і перажытае. Пераважна тое, пра што ніхто, апроч мяне, не напіша і напісаць ня можа. Спадзяюся, маё суб’ектыўнае сьведчаньне дапаможа табе, шаноўны чытач, хоць на нейкую ёту дапоўніць бачаньне мінулай эпохі, адчуць подых майго часу з ягонымі страсьцямі, узьлётамі, памылкамі, забабонамі, і ты зробіш спробу хоць трошачкі зразумець і мяне, і блізкіх, дарагіх мне людзей, і нашых непрымірымых апанентаў, зласьліўцаў і ворагаў, якім, здаецца, я ўжо дараваў усе некалі прычыненыя крыўды. Са свайго боку шчыра выбачаюся, перад усімі, да каго калі-небудзь быў несправядлівы, каму прычыніў боль. Паверце, тое было альбо па непаразуменьні, альбо па глупству...***

...Восеньню 1957-га году мяне праводзілі ў армію, хоць была магчымасьць і “адкасіць” ад яе: рэдактар браўся адгаварыць усё з ваенкамам, калі спатрэбіцца – падключыць райкам, але на мужыка, які не паслужыў у арміі, тады глядзелі ледзь ці не як на непаўнапэннага. У Ленінградзе на вакзале пачуў сенсацыйную вестку аб запуску першага спадарожніка Зямлі, а новы, дваццаты год жыцьця, сустрэў на штрафной мазунінскай заставе, служба і побыт на якой поўна і дакладна выпісаная ў аповесьці “Вяртаньне на Саарэмаа”. Гэта самая дакументальная і самая асабістая з усіх маіх аповесьцяў. Таму няма патрэбы нешта казаць, удакладняць з армейскага перыяду маёй біяграфіі – усё ёсьць у “Вяртаньні на Саарэмаа”...

Дэмабілізаваўся праз два з паловай гады ў сувязі са значным скрачэньнем колькаснага складу арміі і маім рапартам з просьбай адпусьціць раней для здачы ўступных экзаменаў ва універсітэт. Словам, напярэдадні майскіх сьвятаў сыйшоў з цягніка ў Ражанцы, на нейкай спадарожнай дабраўся да Шчучына, і першае, што ўбачыў, дужа засмуціла: з плошчы зьнікла звыклая вежа з гадзіньнікам, а замест яе на высокім п’едэстале ўстала нязграбная, асіметрычная фігура Леніна, зварганеная нейкімі халтуршчыкамі. Іншыя перамены ня кінуліся ў вочы, хіба толькі дрэвы ў парку падрасьлі трошкі.

Не відно было ніякіх зьменаў на цагляным, старой кладкі будынку рэдакцыі, хіба толькі карычневая шыльда трохі выцьвіла. Па знаёмаёй пакатай драўлянай лесьвіцы падняўся на другі паверх. Сустрэлі мяне радасна. Зусім непастарэлы, такі ж энергічны Іван Пятровіч Вераб’ёў адразу ж пазваніў у калгасную кантору, якая займала палову нашага дому, папрасіў перадаць бацьку і маці, каб нікуды не

адлучаліся, бо праз гадзіну-другую завітае да іх у госьці. Прайшоўся па рэдакцыі. Тыя ж кабінеты, праўда, некаторыя аддзелы, у тым ліку і мой родны сельгасгаспадарчы, перамясьцілі, але ў асноўным знаёмыя блізкія людзі. Пазнаёміўся з новым адказным сакратаром – Мікалаем Валяр'янавічам Сасноўскім, сярэдняга веку, гаваркім мацаком невысокага росту. Але больш за ўсё зьдзівіла, што ў крэсьле загадчыка сельгасаддзелу сядзеў Васіль Мацюшаў. Да арміі ён кіраваў дабітым да ручкі калгасам "17 верасьня", куды езьдзілі, калі тэрмінова, у нумар патрэбен быў нейкі крытычны матэрыял. Было дзіва дзіўнае, як ён апынуўся ў рэдакцыі ды яшчэ загадчыкам сельгасаддзелу і маім непасрэдным начальнікам, каго да арміі я больш чым хто чахвосьціў у хвост і грыву за безгаспадарчасьць. Іван Пятровіч патлумачыў і супакоіў: райкам упрасіў патрымаць, пакуль нешта падшукаюць, так што не зважай, ён усё роўна пісаць ня ўмее, пастаўляе факты... У тым я неўзабаве пераканаўся, калі ў першы ж рабочы дзень Вася (так яго ўсе звалі) паклаў на стол, папрасіў пачытаць і паправіць сваю малюсенькую нататку для падвёрсткі на першую паласу. Прабег вачамі: "Камуністычная партыя і савецкая ўлада штодзённа клапоцяцца аб павышэньні жыцьцёвага добрабыту савецкіх людзей. Пра гэта яшчэ раз сьведчыць, што рашэньнем гарсавету ў Шчучыне расшыраны гарадскія могілкі на 2,5 га" – і пакаціўся ад рогату. Аказалася, усе свае матэрыялы ён пачынае па гэтым трафарэце, інакш нічога не атрымліваецца. Вася быў абсалютна бяскрыўдны і памяркоўны, па натуры добры чалавек. З ім мы адпрацавалі месяцы два, тым ня менш ён пасьпеў учыніць мне "дыверсію": пасьля двухгадовага перапынку неўпрыкмет прывучыў да папярос. Спачатку: ну, пацягні разок, нічога ня здарыцца... Пацягнуў раз, другі, трэці – і пайшло-паехала...

Засумаваўшы па любімай рабоце, з небывалым імпэтам калясіў на амаль яшчэ новенькім матацыкле "К-740" па знаёмых калгасах, саўгасах і з найвялікшай цікавасьцю асвойваў Астрынскую зону, якая пасьля ліквідацыі раёну зімою адыйшла да Шчучына. Ня ведаю, чаму раён называлі па імені сярэдняй па велічыні вёскі Васілішкі, калі ўсе раённыя ўстановы знаходзіліся ў даволі салідным гарадскім пасёлку Астрына. Астрына была ўсяго ў няпоўных дзесяці кіламетрах ад нашай вёскі, аднак чамусьці ня надта прыцягвала мясцовых людзей, ва ўсякім разе куды менш, чым у паўтара разы далейшы Скідзель, гэтаксама чужы райцэнтр. У Астрыну ніхто з нашых не ішоў вучыцца ў дзесяцігодку, на базар возам езьдзілі часьцей ў Скідзель альбо за 25 вёрст у Шчучын, чым сюды. Наколькі сябе помню, гэты край заўсёды выклікаў нейкія змрачнавата-страхавітыя асацыяцыі. Мо таму, што быў у паўночным накірунку, дзе ніколі не завісала сонца, і там ляжала змрачнаватае ўрочышча з выразнай назва Цягніліха, дзе спрадвеку блудзілі грыбнікі, непадалёк ад якога і прадзіралася праз гушчары дарога на Астрыну. І вядома ж, таму, што гэта былі ўжо адлесьсі Дубічайскай пушчы, дзе аж да пачатку пяцідзесятых гадоў хаваліся арміякраёўцы і літоўскія "лясныя браты", якія час ад часу забрыдалі і да нас. Апошні іхні візіт запомніўся тым, што вечарам праз акно застрэлілі старшыню нашага сельсавету Аніську, які выступаў на сходзе перад вяскоўцамі. Гэта было, калі я вучыўся ў пятым класе...

Пасьля доўгага перапынку пісалася раскавана, лёгка, натхнёна ва ўсіх газетных жанрах, і ня толькі для роднай газеты. І ўсё гэта ня надта замінала падрыхтоўцы да ўступных экзаменаў на завочнае аддзяленьне журфаку Белдзяржуніверсітэту, паколькі грунтоўна рыхтаваўся яшчэ ў арміі. Не пакідала і паэтычнае натхненьне, "пайшлі" і гумарыстычныя апавяданьні. Першае ж з іх пад назваю "Удалая пастаноўка" зьявілася ў "Вожыку", а неўзабаве аказалася перадрукаваным у перакладзе ва ўкраінскай "Літаратурнай газеце", пра што даведаўся з "ЛІМа". Паслаў у рэдакцыю ліст з просьбай прыслаць той нумар газеты і неўзабаве атрымаў з Кіева пакет з газетай і пісьмом з падзякай за, як было сказана, сапраўды ўдалую пастаноўку. Гэта для мяне было ня толькі радасьцю, але і вялікім

стымулам. Менавіта з гэтай вожыкаўскай публікацыі, здаецца, і пачалася мая больш-менш асэнсаваная літаратурная дзейнасьць як празаіка...

Праз тыдні тры паехаў у Гародню пабачыцца з Міхасём Восіпавічам Васільком, заадно, вядома ж, паказаць яму свае новыя вершы. Але на маё засмучэньне ён быў недзе ў ад'езьдзе, і вершы з просьбай перадаць Міхасю Восіпавічу пакінуў Ірыне Міхайлаўне Суворавай, якая сядзела з Васільком у адным кабінеце. Амаль усе пакінутыя вершы неўзабаве былі надрукаваныя асобнай падборкай, а з Міхасём Восіпавічам так мне і не ўдалося сустрэцца-пабачыцца. Закруцілі ўступныя экзамены, затым месячная ўстановачная сесія ў Менску. Не пасьпеў і вярнуцца, як ашаламляльная вестка: памёр Міхась Васілёк!.. Прынёс яе ўласны карэспандэнт "Гродзенскай праўды" па шчучынскім кусьце Яша Флякс, які толькі што вярнуўся з рэдакцыі. Міхась Восіпавіч не хварэў, па словах Яшы, адчуваў сябе малайцом, ніхто і падумаць ня мог...

Пасьля адыходу чатыры гады назад Якуба Коласа нічыя сьмерць не падавалася мне такой непапраўнай і горкай, не выклікала такога душэўнага ўзрушэньня, як гэтая, Васількова. Ён тут быў легендай, здаваўся бессьмяротным. Якуба Коласа, канечне ж, я ніколі нават ня бачыў, толькі зачытваўся ягонымі творамі, апошнія гады чакаў-дачакацца ня мог чарговых нумароў "Полымя", дзе друкаваўся працяг "На ростанях", страшэнна засмучаўся, калі па нейкіх прычынах нумар выходзіў бяз Коласавай публікацыі. Але Колас, як і хрэстаматыйныя Максім Танк, Пятрусь Броўка, Міхась Лынькоў, Кандрат Крапіва, Аркадзь Куляшоў, былі для мяне небажыхарамі, нават ня верылася, што яны жывуць як звычайныя людзі, і каб хто сказаў тады, што буду мець шчасьце бачыцца, размаўляць з Кандратам Крапівой і Петрусём Броўкам, з Аркадзем Куляшовым у Нясьвіжы нават сыграць у шахматы і, канечне ж, быць разьбітым ушчэнт, пасьля чаго ён згубіў да мяне як шахматыста ўсялякі інтарэс, а з Максімам Танкам і чарку браць – хоць забі не паверыў бы...

Міхась Васілёк быў для мяне і небажыхаром, хоць ягонага партрэта, біяграфіі, вершаў не было ў школьных падручніках, і звычайным простым, сьціплым чалавекам, з якім можна гаварыць на самыя што ні ёсьць будзённыя тэмы, як і ўсе мужыкі, узяць чарку. Вершы Міхася Васілька я ведаў з самага раньняга дзяцінства. Іх чыталі напамяць бацька, маці, нават іншы раз трохі бабуся. І ў вайну, і пасьля вайны, калі зімовымі вечарамі ў нас зьбіраліся пагуляць у карты мужыкі. Бывала, забываюць пра гульню і па старой, яшчэ з польскіх часоў завядзёнцы зусім цьвярозыя пачыналі высьвятляць, хто больш ведае напамяць вершаў і хто лепш іх выконвае. Амаль заўсёды нехта дэкламаваў пра грошы. Як сёньня помню:

Век дваццаты, век харошы,
Абы грошы, толькі грошы...
Стогнуць скрозь сяляне нашы:
– Ах, каб грошы, ах, каб грошы!
Усе падаткі аплаціў бы,
Пану войту дагадзіў бы,
Ён не лаяўся б па "маме",
Не крычаў бы: "Вон стонд, хаме!"
А падаў бы ручку й... проша...
«\Эх, каб грошы, толькі грошы!..

Закупіў бы рыбы, мяса,
Кіло кракаўскай каўбасы,
Хлеба белага з паўторбы
І, дальбог, адзін упёрбы!
Вось тады б я быў харошы,
Эх, каб грошы, толькі грошы!..

Бульба парана, пячона,
Бульба сёньня, бульба ўчора.
Мой трыбух, нібы калода!

А без бульбы няма ходу...
Век дваццаты, век не з горшых...
Абы грошы, толькі грошы.

Вершы запаміналіся адразу. Мо таму, што былі надта ж свае, мужыцкія, народныя, гарэзна-сьмешныя і ў той жа час сумна-невясёлыя. Як:

Эх, гарэліца мая,
Што ты вычаўпляеш,
Ты над намі, мужыкамі,
Літасьці ня маеш.
У Зыдора серадой
Талаку спраўлялі.
Напіліся, ой-ёй-ёй!
Моцна загулялі.
Янка лысы праз парог
Ракам перабраўся,
Праз яго-та, далібог,
Увесь садом падняўся.
Цімох кажа, што ён так
Дапаўзе да хаты,
А Яўхім пярэчыць: “Не,
Брэшаш, трыбухач, ты!”
Той за слова “трыбухач”
Бац Яўхіму ў зубы,
Паднялася “талака”,
Чуб схапіўся з чубам.

(...)

Я ўжо тады ведаў: гэтыя вершы склаў загадкава-таямнічы для мяне Міхась Васілёк.

Потым у час журналісцкіх і чыноўніцкіх паездак па былой Заходняй Беларусі ня раз чуў ад старых людзей, што нашая вёска не выключэньне – завядзёнка зьбірацца грамадой і чытаць напамяць вершы існавала амаль паўсюдна на Гарадзеншчыне, Берасьцейшчыне, заходніх рэгіёнах Меншчыны і Віцебшчыны, у былым Віленскім краі, аддадзеным Сталінам літоўцам. Пра колішнія сьпеўкі, вячоркі з Васільковымі вершамі і песьнямі я ня раз чуў настальгічныя згадкі ад жыхароў Эйшышак, Шалешнік, прылеглых вёсак, вёсачак і хутароў, калі працаваў у Радуні, Воранаве і калі яшчэ не было ніякіх межаў. Амаль паўсюдна старыя людзі расказвалі, што дзеля вершаў Міхася Васілька выпісвалі ўскладчыну “Маланку”, “Беларускую газету”, “Беларускія справы”, “Родныя гоні”, каб вывучыць напамяць, прачытаць альбо прасьпяваць на моладзёвых пагулянках, зарадзіцца іхнім нацыянальна-вызвольным духам. Без усялякага перабольшаньня – Міхась Васілёк пры Польшчы, дый пасьля быў самым вядомым, сапраўды народным паэтам у Заходняй Беларусі. І вельмі горка, крыўдна, што гэты арыгінальны паэт, многія творы якога гучаць, нібыта толькі што напісаныя, сёньня практычна забыты. Невялічкая, трохі больш за пяць друкаваных аркушаў кніжачка ягоных выбраных твораў з харошай прадмовай Уладзіміра Калесьніка апошні раз выходзіла аж у 1963-цім годзе. За гэты час вырасла ці ня два пакаленьні, для якіх Міхась Васілёк – тэра-інкогніта. Быў спадзеў, што да стагоддзя паэта ў 2005 годзе тыя, хто больш за ўсіх крычыць пра клопат пра разьвіцьцё беларускай культуры, ад каго і насамрэч сёньня залежыць усё, даўмеюцца выдаць калі ня больш поўную творчую спадчыну паэта, добрая палавіна якой ня трапіла ў апошняе больш чым саракагадовай даўнасьці выданьне, то хоць паўтараць яго. Але, як кажуць, “пришли иные времена, взошли иные имена” – услужлівых бяздараў, чыя пісаніна запаланіла ўсё і ўся. Гэтая нахрапістая кодла

свайго ня ўпусьціць. Што для іх там нейкі Васілёк, які ня ладзіў з уладай, хай сабе і ня з гэтай, але ўсё роўна дурны прыклад...

Міхась Восіпавіч для мяне быў першы сапраўдны паэт, пісьменьнік, якога пабачыў зьблізку, павітаўся, пазнаёміўся. Адбылося гэта добра памятаю летам 1956 году, калі мяне, наймалодшага ў рэдакцыі, які заўсёды на падхваце, паслалі нарачным у абласную газету аператыўна вырабляць клішэ (пераведзеныя на цынкавыя пласьцінкі фотаздымкі), чаму па дамоўленасьці нашага рэдактара Івана Пятровіча Вераб'ёва меў паспрыяць ягоны калінкавіцкі зямляк і сябра па партызанцы Андрэй Данілавіч Колас – адказны сакратар "Гродзенскай праўды". Мне трэба было чакаць, пакуль іх вырабяць, займацца паўдня чым заўгодна, калі спатрэбіцца, то і пераначаваць на дыване ў Коласавым кабінеце, а раніцай вярнуцца на аўтобусе з гатовымі клішэ. Я даўно меў намер неяк навесьці творчы кантакт з "Літаратурнай старонкай" "Гродзенскай праўды", мо нават пазнаёміцца з самім Міхасём Васільком, які быў літкансультантам у рэдакцыі і вырашаў, што друкаваць і што не друкаваць. І тут, канечне ж, рашыў скарыстаць нагоду – адстукаць адным пальцам на рэдакцыйнай машынцы вечарам з дзесятак вершаў. У дзявятым ці дзясятым класе я ўжо дасылаў у "Гродзенскую праўду" свае вершы і атрымаў надрукаваны на машынцы ліст за подпісам Васілька з парадай вучыцца, больш працаваць над паэтычнай формай і словам... Больш і не турбаваў, друкаваўся ў раёнках. А цяпер палічыў, што сасьпеў...

З заміраньнем сэрца пастукаў у дзьверы з надпісам "Аддзел культуры" на другім паверсе і, пачуўшы водгук, нясьмела зайшоў. За сталом зьлева сядзеў хударлявы, пажылы, хутчэй нават стары чалавек, у якім адразу ж інтуітыўна пазнаў Васілька. Ён ажыўлена гаварыў з нейкім мужчынам, перапыніўся на хвілінку, поглядам папытаўся, што мне трэба. Узяў мае вершы, папрасіў зайсьці іншым разам альбо напісаць адрас – ён адкажа пісьмова. Я сказаў, што зайду, і хуценька зьнік, каб не замінаць...

Але перш, чым сустрэцца з Міхасём Восіпавічам у Гродне, я яшчэ ў дзевятым класе пасьпеў пабыць у ягонай Баброўні, куды мяне запрасіў аднакласьнік Толік Курыла, які даводзіўся Васільку нават нейкай раднёй. Мне надта ж хацелася пабачыць ягоную хату, сядзібу, паблукаць па дарожках і сьцяжынках, дзе хадзіў легендарны паэт.

Вёска прымасьцілася на беразе тады яшчэ паўнаводнай і быстрацечнай Котры і ўразіла суцэльнай белай чаромхавай кіпеньню, настоеным на яе дурманлівых пахах паветрам і ледзь ці не вар'яцкім салаўіным гармідарам, нязважна, што быў яшчэ дзень. Пахадзілі па вёсцы, пастаялі, а потым Толік ледзь ці не сілком зацягнуў у Васількову хату, дзе жыў нехта са сваякоў. Я пачуваў сябе дужа ніякавата, непакоячы незнаёмых людзей, толкам не пасьпеў нічога разгледзець, дый нічога не кідалася ў вочы, звычайная сялянская хата. Пасядзелі на беразе Котры, паспрабавалі падобнай на вялікі сачок сеткай лавіць рыбу, але марная справа. Паабедаўшы ў Толіка, праз колькі гадзін паехаў назад у бок Скідзеля, хоць напрасткі да Вострава нейкіх сем-восем кіламетраў, але не было дарогі. Канечне, ведаючы, можна дабрацца ляснымі сьцяжынкамі, а ня ведаючы – лепш ня совацца, бо можаш апынуцца дзе-небудзь пад Шчанцом, а то і аж ля Астрыны. Тады яшчэ ня ведаў, што родам з Бароўні і Макар Краўцоў – аўтар першага беларускага гімну "Мы выйдзем шчыльнымі радамі", больш таго – той меў, як і Васілёк, прозьвішча Касьцевіч і даводзіўся яму родным дзядзькам...

У наступны мой прыезд у Гародню гэтаксама не ўдалося добра пагаварыць з Міхасём Восіпавічам, хоць і пачуў ад яго вельмі для мяне важнае. Ён пасьпеў з алоўкам прачытаць мае вершы, зычліва паказваў, дзе добра, дзе трэба падумаць-пакруціць фразы, выразы, а ў цэлым пахваліў: пашліфуй яшчэ трохі з улікам

заўвагаў і прысылай альбо прывозь пры нагодзе, будзем друкаваць. У мяне выраслі крылы. А ён не адпускаў, зацікаўлена распытваў, хто, адкуль я родам, аднак у кабінет зайшлі, па ўсім відаць, добра знаёмыя яму людзі, да якіх ён меў нейкі неадкладны інтарэс, вінавата папрасіў: пазнаёмімся бліжэй, пагамонім ўволю наступным разам...

Наступны раз быў недзе праз тыдні два, калі я зноў прывёз выраблянць клішэ. Міхасю Восіпавічу спадабалася, як паправіў вершы, пахваліў і цьвёрда сказаў: будзем рыхтаваць да друку. Даведаўшыся, што я амаль ягоны зямляк, пачаў прыгадваць: бываў ці не бываў ён у нашай вёсцы, калі некалі хадзіў арганізоўваць ячэйкі сялянска-работніцкай Грамады. А як уведаў, што я вучыўся ў Скідзелі, друкаваўся ў “Красном знамени”, дзе ён працаваў пасьля вайны, ягоныя вочы яшчэ больш пацяплелі. А праз тыдні два, сустрэўшы мяне пад вечар на вуліцы, ня толькі пазнаў, а шчыра, з лёгкім дакорам запытаў: чаму не заходзіш? Ды ніякавата, кажу, так сабе, без усялякай патрэбы турбаваць, адрываць ад важных спраў.

– Ды якія там важныя справы! – махнуў рукой Міхась Восіпавіч. – Заходзь заўсёды, як толькі будзеш у Гародні, не саромся, я заўжды рады бачыць землякоў... – І нечакана прапанаваў: – Калі не сьпяшаешся – пойдзем пагуляем разам, бач пагода якая! Заадно і пагаворым...

Ён быў у добрым гуморы, распытваў, сам нешта расказваў, але больш распытваў. На кожным кроку яго пазнавалі, здароўкаліся і на мяне паглядвалі з цікаўнасьцю, што вядома ж, усьцешвала маю душу. Неўпрыкмет выйшлі да Нёману, дзе на прывязі, зьлёгку пагойдвачыся на плыні, стаяў баркас, прыстасаваны пад піцейную ўстанову. Міхась Восіпавіч пацікавіўся, ці я ўжо бяру чарку, і пачуўшы, што бяру патрошку, прапанаваў наведаць “паплавок”. Узялі – я толькі губы памачыць за кампанію, а ён то і добра, і гаворка ажывілася. Мне хацелася як мага больш пачуць і пра ягоную творчасьць, і пра рэвалюцыйную дзейнасьць у КПЗБ, і пра змаганьне ў партызанах, антыфашыстоўскім камітэце, аднак Міхась Восіпавіч ня надта ахвотна, толькі агульнымі словамі гаварыў на гэтыя тэмы, мне падалося, з-за сваёй сьціпласьці. Куды ахвотней апавядаў розныя вясёлыя эпізоды і гісторыі, удзельнікам якіх быў сам ці чуў ад некага, альбо пераводзіў гаворку на звычайную застольную гамонку. А ўвогуле яшчэ больш умацоўвалася ўражаньне, што ён любіць больш слухаць, чым гаварыць, нават калі субяседнік, як я, амаль жоўтароты шпачок. Мо з гадзіну прасядзелі ў тым “паплаўку”, затым праводзіў яго да дому. Жыў Васілёк тады насупраць педінстытуту, не даходзячы да храма ў старэнькім дамку з невялічкім дворыкам і хлеўчукамі ля спуску да Гараднянкі. Міхась Восіпавіч запрасіў зайсьці ў хату, але гэта было ўжо занадта, і я адмовіўся, спаслаўшыся, што клішэ вось-вось будуць гатовыя і хачу патрапіць на аўтобус... Потым я ня раз бываў у Васільковай гасьціннай хаце, дзе за лёгкай чаркай слухаў ягоныя цікавыя расповеды і пра Вільню, і пра Казлоў, цяперашні Мічурынск, дзе быў з бацькамі ў бежанстве, і пра сустрэчы з Якубам Коласам, каму яшчэ ў дваццатыя гады прысьвячаў вершы, якія друкаваліся ў заходнебеларускіх выданьнях і нейкім чынам даходзілі да Канстанціна Міхайлавіча. А пасьля вайны пры сустрэчы і асабістым знаёмстве на нейкім пісьменьніцкім сходзе дзядзька Якуб нахмурыў бровы і строга сказаў пры людзях: во, гэта ён замінаў мне расьці! Вытрымаў нейкі час недаўменныя позіркі, засьмяяўся: я ж – колас, а ён – васілёк...

Потым Міхася Восіпавіча перасялілі ў больш прасторны падобны на абшаляваную вагонкай стадолу дом на вуліцы Карбышава, а ягоны, дзе пражыў больш за дзесяць гадоў, зьнесьлі і на тым месцы ўзьвялі гмах абласнога Дома палітасьветы. Не магу дараваць сабе, што ў свой час не даўмеўся дамагчыся адзначыць гэта мемарыяльнай дошкай. Шкада, што, як кажуць, добрая мысьля заўсёды прыходзіць апасьля...

Калі прызнацца шчыра, то і псеўданім Блакіт зьявіўся праз Васілька, хоць ён

пра тое і не здагадваўся. Любімы мой колер – блакітнае неба, блакітны васілёк. Мне, васемнаццацігадоваму, тады здавалася, што ледзь ці ня ўсе сапраўдныя пісьменьнікі мелі ці маюць прыгожыя псеўданімы – Янка Купала, Якуб Колас, Зьмітрок Бядуля, Кандрат Крапіва, Максім Танк, Янка Маўр, Міхась Васілёк, нават Янка Брыль, Ніл Гілевіч падаваліся псеўданімамі... І ўвосень 1956 году са старонак шчучынскага “Чырвонага сьцяга” зьніклі вершы Валянціна Болтача, а на раённым паэтычным неасхіле з’явілася новая зорка – Валянцін Блакіт. Неўзабаве яна перакачавала на старонкі абласной газеты, рэспубліканскіх выданьняў, але з цягам часу стала з’яўляцца радзей і радзей, каб у рэшце рэшт скаціцца паэтычнай зьнічкаю і праз гады ўзыйсьці на сатырычна-гумарыстычным небасхіле. Нават сам не ведаю, чаму стаў падпісваць гэтым малапрыдатным для сатырычных жанраў псеўданімам гумарэскі і апавяданьні. Пэўна, па двух прычынах: не меў поўнай упэўнасьці, што гэта ўсурёз і надоўга, і па-другое, ў той час займаў сур’ёзную пасаду ў вельмі сур’ёзнай установе, дзе, ведаў, яўна падазрона паставяцца да такіх несур’ёзных заняткаў. А калі выйшла першая кніжка ў “Бібліятэцы “Вожыка”, псеўданім набыў нейкае літаратурнае жыццё, крэсьліць якое не падымалася рука і тады, як стаў пісаць “сур’ёзныя” аповесьці...

Асабліва зблізіў нас з Міхасём Восіпавічам ягоны прыезд у Шчучын і паездка да нас у вёску. Не памятаю, ці яны разам з Пятром Прыходзькам прыбылі ў Шчучын, ці тут сустрэліся выпадкова, помню толькі, што ў раённым Доме культуры яны выступалі разам. Назаўтра з Міхасём Восіпавічам мы паехалі на рэдакцыйным “ІЖ”ы ў нашае Вострава, дзе, як я нарасказваўся, яго так любяць і шануюць. Ехаць бы па шашы на Пратасаўшчыну – хоць і далей, але дарога добрая, а я, як заўсёды, рашыў скараціць – на Еўлашы, дзе таксама неблагі гасьцінец, за выключэньнем некалькіх невялікіх пясчаных мясьцінаў, якія ці не штодня спакойна адольваў з ходу. І тут не даўмеўся збавіць хуткасьць – і... кола пайшло ўбок юзам, не пасьпеў і сьцяміць, чаму матацыкл ляжыць зьлева на абочыне, а Міхась Восіпавіч – наперадзе ў сыпучым пяску пасярод дарогі. Абамлеў: пакалечыў ці забіў Васілька!.. А тым часам Міхась Восіпавіч ускочыў жвавенька, пра мяне хвалюецца: ну, як ты? Адлягло ад сэрца: Міхась Восіпавіч, прабачце...

Убачыўшы, што нічога сур’ёзнага ні са мной, ні з матацыклам ня здарылася, Міхась Восіпавіч пачаў радасна супакойваць:

– Гэта ж здорава, Валічак, што зваліліся! Запомніцца, а то назаўтра і забылі б...

Пэўна, яно так...

Бацька, маці напачатку не хацелі даваць веры, што прывёз таго самага Васілька, а як пераканаліся – разгубіліся, ня ведалі, як паводзіць з гэтакім шаноўным госьцем, што паставіць на стол, аднак не прайшло і пяці хвілінаў, а яны ўжо былі як даўнія знаёмцы. Прыгадвалі польскія часы, чыталі ягоныя вершы, а з бацькам даўспаміналіся, што ў вайну ў Шчанцы ў абодвум знаёмага Івана разам ціснулі самагонку. З таго часу бацька заўсёды перадаваў са мною яму пляшачку першаку. Неўзабаве нейкім чынам даведаліся суседзі і набілася паглядзець на Васілька ледзь ці ня поўная хата... Гамонка ў іх закончылася з другімі пеўнямі, калі я спаў сном праведніка. Назад паехалі назаўтра далей ад бяды – па добрай дарозе на Пратасаўшчыну. У гасьцініцы нас чакаў радасна-узбуджаны Пятро Прыходзька: паслухайце, якога верша напісаў, пакуль вы гулялі...

Я вельмі зьдзівіўся, калі даведаўся, што Міхась Восіпавіч ня член партыі. Чалавек, які напісаў столькі пранікнёных рэвалюцыйных твораў, на маё глыбокае пераканаиньне, проста ня мог ня быць членам партыі. Неяк выказаў яму сваё неўразуменьне. Міхась Восіпавіч глянуў дапытліва, трохі іранічна і аджартаваўся:

– Ды надта ж стары я, каб пачаць звацца маладым камуністам. Ну, і выпіваю – які ж з мяне камуніст...

Такі адказ, канечне, ня мог мяне задаволіць і я, не разумеючы, наколькі гэта нетактоўна, ня раз яшчэ прыставаў да яго з гэтым пытаньнем, і заўсёды ён далікатна ўхіляўся ад адказу, зводзячы ўсё на жарт. І па сёньняшні дзень Васількова беспартыйнасьць для мяне – неразгаданая таямніца. К таму часу распусчаная Сталіным КПЗБ як правакацына-шпіёнская была цалкам рэабілітаваная, ейным членам амаль аўтаматычна давалася членства КПСС, вяртаўся партстаж. Варта толькі было напісаць заяву ў парткамісію і спаслацца на сьведкаў. Васількова членства ў КПЗБ друкавана засьведчвалася ня толькі ягонымі паплечнікамі па рэвалюцыйнай дзейнасьці Максімам Танкам і Валянцінам Таўлаем, але і адным з арганізатараў і кіраўнікоў КПЗБ Мікалаем Арэхвам, які ў Інстытуце гісторыі партыі займаўся пытаньнямі рэабілітацыі. Чаму, здавалася, абсалютна лаяльны да савецкай улады Васілёк не схацеў пісаць заяву? Незразумела...

Для мяне ён быў крыштальна сумленны, да мяккасьці далікатны, тактоўны чалавек, сапраўдны інтэлігент і адначасова тыповы селянін – ня надта гаваркі, разважлівы, стрыманы, хто ніколі не выварочвае некаму напаказ сваю душу. Яго ніколі не карміла паэзія, ён сам сваім сялянскім мазалём карміў сваю паэзію. Я дзівіўся, не хацеў даваць веры, што за свае вершы пры санацыйным польскім рэжыме ён ня меў ні грошыка, выдаваўся за свой кошт, прадаючы на базары вырашчанае і намалочанае жыта, выгадаванага бычка ці цялушку. Паверыў, калі праз семдзесят-восемдзесят гадоў сам дажыў да таго ж самага пры рэжыме, які выдае сябе за народны і ня з меншым, а мо нават большым імпэтам і апантанасьцю вынішчае народную мову, літаратуру, культуру... Мо таму, што Міхась Васілёк надта ж добра ведаў цану хлебу, ягоная псіхалогія, звычкі на ўсё жыцьцё засталіся сялянскімі. Нават такая дэталька: машынальна, хутчэй за ўсё падсьвядома, на нейкім сакральным узроўні ён ніколі не дазваляў сабе змахнуць на падлогу хлебныя крошкі са стала, акуратна, самавіта зьмятаў іх у жменю і кідаў у рот. Як і мая маці, як і ўсе сяляне старэйшага веку. Тое ж міжволі часта рабіў і Васіль Быкаў. Амаль анекдатычны выпадак, які падкрэсьлівае генетычнае непрыняцьце марнатраўства, неашчаднасьці ягонай сялянскай натурай, што ўдосталь зьведала нястачаў і нягодаў: з нейкай дэлегацыяй ці групай Міхась Васілёк пайшоў на знакамітую мясцовую тытунёвую фабрыку, дзе гаспадары вялікадушна прапанавалі курцам прадэгуставаць шматлікія ўзоры сваёй прадукцыі. Стары курэц Міхась Восіпавіч надэгуставаўся так, што вывелі ледзьве жывога, а потым шчыра зьдзіўляўся: як жа гэта можна выкідаць, не дакурыўшы?!

Неяк угаварыў Міхася Восіпавіча хоць адзін свой новы твор даць для нашай газеты, і неўзабаве па пошце ў рэдакцыю на маё імя прыслаў напісаны сваім акуратным прыгожым почыркам верш. Рэдактар тут жа распарадзіўся надрукаваць яго буйным шрыфтам на першай старонцы, хоць па тэматыцы верш быў ня надта, мо зусім ня першапалосным. А праз дзень я павёз вырабляць клішэ і ўручыў газету Васільку, падзякаваўшы і абсалютна шчыра расхвальваючы верш. Міхась Восіпавіч глянуў скрушліва, сьцяў жаўлакі, нібы стрымліваючы сьлязу, махнуў рукой, усьміхнуўся журботна-сумнай усьмешкай:

– Вершы, Валічак, я пісаў у дваццатых, трыццатых... Ды гэта і ты бачыш... – памкнуўся яшчэ нешта сказаць, але перадумаў, характэрным жэстам адмахнуўшы рукой, і адразу ж пазмрачнеў, замыкаючыся ў сабе.

Я абагаўляў Міхася Восіпавіча, ніколі і ў галаву мне не прыходзіла параўноўваць старыя і цяперашнія ягоныя вершы, разумеючы, што пісаліся яны ў іншыя часы, у іншых абставінах, у рэшце рэшт у іншым узросьце, хоць, канечне ж, гэтая розьніца была навідавоку. Аднак быў вялікі сумнеў, што толькі гэта няўцешнай скрухай аглытвае ягоную душу. Заглянуць бы! Але туды ён не хацеў пускаць нікога, а калі і падпускаў, то толькі на пэўную адлегласьць, да нейкага нябачнага парожка. Разам з тым нават ад мяне, маладога, неспрактыкаванага, яму цяжка было

хаваць нейкую таямніцу, што гнятлівым цяжарам ляжала на ягонай душы, ад чаго, мусіць, часам здаваўся нейкім трохі разгубленым, нават напалоханым. Потым мне Васіль Быкаў расказваў (гэта ж ён засьведчыў і ў сваёй кнізе “Далёкая дарога дадому”), што Васілька ледзь ці не штодня цягалі ў КДБ, а чаго – не казаў нікому, перапальваючы ўсё у сабе, спальваючы сваё сэрца зусім не на кастры паэзіі...

На сёньняшні розум, тады па маладой ахламоністасьці часам дазваляў сабе ў стасунках з Васільком нетактоўнасьць, за якую зараз ніякавата, хочацца прабачыцца. Хоць бы такое...

Тады былі ў модзе абласныя агляды-конкурсы ведамасных самадзейных мастацкіх калектываў. Наступіла чарга прадэманстраваць свае таленты і работнікам спажывецкай каперацыі. Ня ведаю, як дзе, а нашы шчучынскія зафрахтавалі на конкурс мастацкі калектыў раённага Дому культуры, у якім і я выступаў з чытаньнем сваіх вершаў. Разьмеркавалі, як каго прадстаўляць будуць – прадаўцы, нарыхтоўшчыкі, таваразнаўцы і г. д. Фельетон сам плыў у рукі. Шчучынцы (па алфавіце) выступалі самымі апошнімі, і пасядзеўшы, паслухаўшы трохі, пайшоў наведаць Міхася Восіпавіча – рэдакцыя тады разьмяшчалася побач, лічы ў адным будынку з абласным Домам народнай творчасьці, дзе праходзіў конкурс. Пасядзелі, пагаманілі, схадзілі ў забягалаўку, дзе я прапанаваў, а Васілёк весела пагадзіўся выступіць за Шчучынскі райспажыўсаюз: а чаму б і не, мая ж Баброўня цяпер у Шчучынскім раёне!.. Не, ён ня быў п’яны, проста часам у добрым гуморы яго так і пад’юджваў малады гарэзьлівы настрой. Наш мастацкі кіраўнік не паверыў такой удачы, стаў пытацца, як прадставіць Васілька: таваразнаўцам ці яшчэ кім? Канечне ж, прадстаўляць Васілька, якога навылёт ведае журы, таваразнаўцам са Шчучына было б верхам камізму, але ў мяне хапіла розуму сказаць, каб прадставіў як земляка, які карыстаецца паслугамі мясцовай кааперацыі. Першае месца Шчучыну было забясьпечанае, і кіраўніцтва райспажыўсаюзу запрасіла ў рэстаран з сервіраванымі па вышэйшым класе ссунутымі літарай «Т» сталамі. Міхась Восіпавіч быў у цэнтры ўвагі. Пры гэткай закусі гарэлка ня надта хмяліла. Калі мы аўтобусам падвезьлі яго пад самую хату, Міхась Восіпавіч шапнуў мне: а ты, Валічак, не пішы свайго фельетону...

Апошні раз бачыліся з ім у канцы верасьня пяцьдзесят сёмага году. Тады перад адыходам у армію сьпецыяльна зьездзіў у Гародню разьвітацца з Міхасём Восіпавічам. Добра пасядзелі-пагаманілі ў ягоным утульным дамку на беразе Гараднянкі, спустошваючы перададзеную бацькам пляшку пякучага, як сьпірытус, чыстага, як сьляза, першаку, якому Міхась Восіпавіч заўсёды аддаваў перавагу і перад “белай”, і перад каньяком. Пасьля іхняга знаёмства бацька заўсёды перадаваў са мной свой прэзент Васільку. У хаце Міхася Восіпавіча я заўсёды адчуваў шчырую цеплыню і амаль бацькоўскае стаўленьне да сябе і гаспадара, і гаспадыні – клапатлівай, дабрэйшай душы цёткі Вольгі. На разьвітаньне яны пажадалі мне добрай службы і хуткай сустрэчы.

На жаль, больш не давялося сустрэцца-пабачыцца. Расказвалі, што ў апошнія гады Міхась Восіпавіч выглядзеў асабліва змарнелым, пастарэлым, хоць заўсёды падаваўся куды старэйшым за свае гады. Памёр нечакана, раптоўна, не хварэючы, і сёньня аж ня верыцца – усяго толькі на 55-тым годзе жыцьця. Два дні пра ягоную сьмерць маўчалі, як пра немаведама якую дзяржаўную таямніцу. Афіцыйнае паведамленьне зьявілася на трэці дзень, калі ўжо хавалі нябожчыка. Магчыма, нешта ўзгаднялі па інстанцыях, а хутчэй за ўсё, ведаючы Васількову папулярнасьць, асьцерагаліся, панічна баяліся наплыву народу з блізкай і далёкай перыферыі, ператварэньня пахаваньня ў масавую дэманстрацыю... Ды працаваў бяздротавы тэлефон, і разьвітацца са сваім паэтам прыйшло-прыехала столькі народу, што не ўмяшчалі прылеглыя вуліцы – сьведкі сьцьвярджаюць, што ні да гэтага, ні пасьля ў Гродне не было яшчэ такога люднага пахаваньня... На жаль, бяздротавы тэлефон у нас у рэдакцыі аказаўся “сапсаваным”, дакладней – нехта ў “Гродзенскай праўдзе”

ці то па няведаньні, ці то знарок увёў у зман, нібыта пахаваньне Міхася Васілька, куды мы сабраліся ехаць ледзь ці ня ўсёй рэдакцыяй, адбудзецца на дзень пазьней.

Аглушаны чорнай навіной нейкі час быў паралізаваны, ня ведаў, што рабіць, што прадпрымаць, потым машынальна кінуўся да стала, і сьцінаючы сьлёзы запісваў на паперу прачулыя пякуча-горкія словы пра песьняра:

Так, ты памёр. Цябе няма ў жывых,
Халодны жвір прысыпаў грудзі...
Асеньні дожджык церушыць
І перапёлкі ранак будзяць.
Зноў сонейка ўстае па-над зямлёй,
Бярозкі верасень крануў крылом халодным,
А вербы плачуць, плачуць над ракой,
Кідаюць лісьце ў Нёман паўнаводны...

Словы клаліся ў радкі, строфы, здавалася, ліюцца з самога сэрца, то горкія, то наіўнаватыя сьцьвярджальна-аптымістычныя кшталту: “паэт памёр, а голас малады ў народзе жыць заўсёды будзе”. Ня ведаю, колькі часу прайшло, здаецца, зусім нямнога, роўна столькі, каб Фядотаву, нарэшце, удалося злавіць некага на тэлефоне абласной рэдакцыі і даведацца, што якраз у гэты час Васілька ўжо хаваюць. Ехаць не было ніякага сэнсу... Перапісаў начыста верш, заканвертаваў і пабег на пошту, каб пасьпелі адправіць з машынай, што забірае карэспандэнцыю пасьля абеду па дарозе з Ліды, а, значыць, заўтра раніцай верш будзе ў рэдакцыі. Назаўтра пазваніў Ірыне Міхайлаўне Суворавай, яна сказала, што верш вельмі спадабаўся, і разам з прысьвечанымі Васільку творамі іншых аўтараў пойдзе ў заўтрашні нумар.

Назаўтра ніякіх вершаў, апроч кароценькага казённага рэпартажу з пахаваньня, у газеце не было. Даведаўся, што яны ўжо стаялі ў нумары, але ў апошні момант аднекуль паступіла каманда: ніякіх вершаў, ніякіх панегірыкаў...

Прачытаўшы мой верш памяці Міхася Васілька, наш рэдактар распарадзіўся зьняць што-небудзь з ужо зьвярстанага нумара і паставіць яго туды...

Той 1960 год быў надзвычай багаты на важныя падзеі ў маім жыцьці. Гэта і вяртаньне з арміі, і паступленьне на вучобу ва ўніверсітэт, і страта паважанага, амаль што роднага чалавека, якім быў для мяне Міхась Васілёк, і нечаканы кар’ерны узьлёт з трохі дэтэктыўным прысмакам...

Неяк позна восеньскім вечарам мяне пабудзілі, паднялі з ложку настойлівыя, патрабавальныя стукі ў акно. Хто там, што здарылася?!

Пад акном стаяў Мікола Каралёў, намесьнік рэдактара жалудоцкай раёнкі, і незнаёмы мне чалавек.

– Адчыняй! – загадаў Мікола. – І калі, насьпех нацягнуўшы штаны і кашулю, упусьціў іх, паказаў на мяне: – Ну во ён самы... – І прадставіў незнаёмца: – Абрам Данілавіч Змудзяк, рэдактар жалудоцкай “За Радзіму”, твой новы шэф...

Яшчэ ня скінушы з сябе астаткі сну, я нічога не зразумеў. Каралёў працягнуў мне паперку:

– Чытай...

Прачытаў, працёр вочы, не магу зразумець – на фірменным бланку абкаму партыі за подпісам сакратара па ідэалогіі: “Секретарю Желудокского райкома КП Белоруссии товарищу Николаенкову. В Ваше распоряжение направляется Болтач Валентин Владимирович для использования его в должности заместителя редактора районной газеты”... Нейкі розыгрыш ці што? Ды-ы абкамаўскі бланк, абкамаўская пячатка, з такімі рэчамі не жартуюць...

– А ты куды? – пытаюся ў Міколы.

– З сёньняшняга дня – загадчык аддзелу прапаганды райкаму... Так што тры дні на зборы – і ўпрагайся ў работу...

– Як так? – пытаюся разгублена. – Не пагаварыўшы, не спытаўшы згоды...

– Партыя сказала: трэба, камуніст адказвае: ёсьць! – падміргнуў з гарэзьлівай усьмешкай Мікола...

Во гэтак і адбыўся мой кар'ерны скачок з радавога літраба ў намесьнікі рэдактара. А па вялікім рахунку зроблены пачатак, калі ў цябе ня надта пытаюцца, хочаш ты ці ня хочаш, тваім лёсам пачынае распараджацца партыя. Праўда, можна ўперціся, як баран у новыя вароты, калі ёсьць жаданьне, каб на цябе махнулі рукой, задавальняе персьпектыва бязвыездна дасядзець да пенсіі літрабом, у лепшым выпадку загадчыкам аддзелу ў сваёй раёнцы.

Пераязджаць у Жалудок, дакладней – пакідаць сваю родную рэдакцыю, калегаў, з якімі гэтак шчыра здружыліся-спрацаваліся, вельмі ж не хацелася. Першым, да каго зайшоў параіцца раніцай і паказаў абкамаўскае накіраваньне, быў Фядотаў. Аказалася, ён ужо ведаў – пры ім учора пад вечар рэдактару званіў з абкаму загадчык сектару друку Русаковіч. Іван Пятровіч трохі паўпіраўся: мы ледзь ці ня год трымалі для яго вакансію, планавалі ў бліжэйшы час прызначыць загадчыкам аддзелу, а вы знайшлі сякеру пад лаўкай, але ў рэшце рэшт здаўся – надта ж важкае вылучэньне. Шкада, канечне, разважыў Уладзімір Мікалаевіч, але табе і насамрэч расьці трэба. Змудзяк – мужык харошы, Мікола – райкамаўскі начальнік, дый брата Міхаіла ты ведаеш. У крыўду не дадуць... І Жалудок зусім побач, у нейкіх дваццаці кіламетрах, лічы, прыгарад Шчучына... Так што будзем бачыццасустракацца...

Тое, што рэдактар ужо ведае пра маё вылучэньне, мусіла трохі спрасьціць нашую гаворку, хоць усё роўна адчуваў перад ім незразумелую віну і ніякаватасьць. Іван Пятровіч быў чалавек прамы і адкрыты, часам рэзкі і грубаваты, але адходлівы і справядлівы, зла не трымаў за пазухай, за што яго паважалі і любілі... Шчыра расказаў, што дзеецца ў мяне на душы, і ён паглядзеў з разуменьнем, супакоіў: ты ж не бяжыш на літрабаўскую пасаду ў Гродна, Ліду, ці Слонім альбо Навагрудак. А для цябе гэта выдатны старт, і я рады, хоць, канечне, разьвітацца шкада... Дый едзеш ня к чорту на выселкі куды-небудзь у Іўе ці Астравец...

Тады газеты, як і раёны, розьніліся па катэгорыях і, адпаведна, па перыядычнасьці, штатах, акладах, ганарарным фондзе. Катэгорыя, натуральна, вызначала і прэстыжнасьць выданьня. Адно Ліда, другое Слонім, Навагрудак, Ваўкавыск, Шчучын і трэцяе Іўе ці Зэльва, пра якія ў кіруючых наменклатурных колах хадзіла пагаворка: Бог стварыў неба і зямлю, а чорт – Іўе і Зэльву. Жалудок па катэгорыі быў нараўне з тымі ж Іўем, Зэльвай, Астраўцом, Радуньню, Воранавам, але ня гэта мяне тады хвалявала. Непакоіла: як сустрэнуць, як успрымуць, як паставяцца ў калектыве да маладога, жоўтаротага намесьніка рэдактара, які ня мае нават незакончанай вышэйшай адукацыі, а ў рэдакцыі – людзі пераважна сталага веку, багатага жыцьцёвага вопыту, са шматгадовай газетнай практыкай?

Але ў творчых калектывах усё значна прасьцей: мяркуюць не па ўзросьце і пасадзе, а па тым, што ты можаш. А я сёе-тое ўмеў, дый энергіі было хоць адбаўляй. І калі ў газеце бесьперапыннай плыньню пайшлі матэрыялы ў розных жанрах, асабліва пасьля амаль на ўсю паласу вершаванага сатырычна-гумарыстычнага рэйду пад колішняй астрашкоўскай запеўкай "Няхай злуецца той, каму няміла..." пра парадкі ў райбыткамбінаце, нават такія газетныя аксакалы, як загадчыкі аддзелаў Восіпаў і Хілько, пачалі ставіцца паважна, прыслухоўвацца і прымаць любую заўвагу ці праўку. Словам, стаў пачуваць сябе ў новай ролі свабодна і камфортна. Таму спрыялі і добрыя, даверчыя, таварыскія стасункі з рэдактарам Абрамам Даніланвічам, якія ў нас склаліся адразу ж, у многім дзякуючы Міколу Каралёву.

За нейкі месяц на амаль новенькім К-740, які перайшоў у маё аднаасобнае

карыстаньне, паколькі ніхто ў рэдакцыі вадзіць яго ня ўмеў, а рэдактар карыстаўся старэнькім “Масквічом”, аб’ехаў увесь раён, у тым ліку пакалясіў і па трохі знаёмых лясных дарогах у занямоньні, дзе некалі бывалі з Уладзімірам Фядотавым зьбіраючы матэрыял да ягонай кнігі “Мёртвыя застаюцца жывымі”, пазнаёміўся з кіраўнікамі калгасаў і саўгасаў. У раёне было нямала моцных гаспадарак, значна больш, чым у Шчучынскім, шмат старшыняў сапраўдных народных самародкаў, як Міхаіл Іванавіч Буча ў вёсцы Дзікушакі, які пазьней стане адным з галоўных прататыпаў Кунцэвіча ў “Шануй імя сваё”. Такіх, як Мікалай Манікала, які выдатна гаспадарыў у занёманскім калгасе на пясочках і палянах, а потым, калі перакінулі ў дабіты да ручкі калгас у Гасьцілаўцах, і яго за нейкі год вывеў у людзі. Прастаршыняваў ён тут амаль паўстагоддзя, сустракаліся з ім ня раз у розныя гады і пры розных абставінах. Ці прадстаўнічы, рашучы данскі казак Канцадалаў, які ледзь-ледзь не атрымаў Зорку Героя. А якую фірменную данскую юшку ён умеў варыць! Ці сын сонечнай Адыгеі Аслан Чухо, які ўжо ў тыя гады ўмудраўся на вялікіх плошчах вырочваць кукурузу ня толькі на зерне, але і на насеньне. А ягоны сакратар партарганізацыі па прозьвішчы Груца быў увогуле чалавек з неспасьцігальнымі здольнасьцямі. Калі расказвалі – нізашто не хацеў даваць веры, пакуль на свае вочы не пабачыў, як ён нырае ў Нёман і вынырвае з ладнай рыбінай у кожнай руцэ А іншы раз дык яшчэ адну трымае ў зубах. Два-тры ныркі – і ёсьць на ўварыстую юшку.

Тады пра сталоўкі ў вёсках ніхто ня ведаў, таму, звычайна, старшыні мелі чысты дом з акуратнай і ўмелай гаспадыняй, якой выдзялялі прадукты ці плацілі, і сюды вадзілі падсілкавацца камандзіровачнікаў сярэдняй рукі. Высокіх і шаноўных гасьцей старшыня ці сакратар партарганізацыі запрашалі да сябе дадому, а летам часьцей за ўсё арганізоўвалі пікнічок з наварыстай юшкай на прыродзе ў ціхай маляўнічай мясьціне, даўно аблюбаванай для гэтай мэты...

Чаго-чаго, а рэдкай прыгажосьці мясьцінаў і краявідаў у раёне хапала. Ад лідскай Беліцы на паўднёвым усходзе да шчучынскіх Ракавіч на паўночным захадзе больш за пяцьдзесят кіламетраў па краі раёна працякаў тады паўнаводны, багаты на розную рыбу Нёман з дубовымі гаямі і заліўнымі лугамі па берагах. Рыбай кішэлі сярэдняй велічыні Дзітва і Лебяда, усе маленькія ручаі і ручаінкі, дзе можна было парыбаліць на стронгу, налавіць ракаў. Ну і канечне ж, аж дых займалі стройныя жоўтастволыя сосны Ліпічанскай пушчы, дзе восеньню высыпала літое карычневапузае, чорнагаловае баравіччо...

Як без ахвоты ехаў у Жалудок, так быў задаволены, рады, нават шчасьлівы, што прыехаў – мусіць, заўсёды так бывае. Зрабіў нечаканае адкрыцьцё: а жыць і працаваць у маленькім гарадку, дзе кожны кожнага ведае, дзе ты заўсёды ва ўсіх на віду, куды цікавей, чым у гарадской абязьлічцы. А галоўнае – тут была зусім іншая службовая атмасфера з больш шчырымі і цёплымі, пазбаўленымі інтрыжак і недобразычліўства стасункамі між людзьмі, у якой кожны пачуваў абсалютна натуральна, як рыба ў вадзе. Ва ўсякім разе я адчуваў сябе тут менавіта так, меў поўную свабоду дзеяньня, канечне ж, у межах літаўскага “Перечня”, установак ЦК КПСС і ўказаньняў райкаму партыі, якія пры добрым паразуменьні з ягоным начальствам можна было і безпакаранна праігнараваць альбо разумна абыйсьці. Рэдактар быў чалавек вельмі заняты – толькі першы сакратар райкаму і ён засядалі і на бюро, і на выканкаме, а тады было нормай, што гэтыя доўгія на ўвесь дзень пасяджэньні праводзіліся па разу, а то і па два разы на тыдзень. Да ўсяго як член бюро райкаму і выканкаму райсавету ён меў замацаваны калгас, за які як упаўнаважаны адказваў галавой і партбілетам. А яшчэ ў Абрама Данілавіча была і на ўсё жыцьцё засталася неадольная звычка корпацца ў машыне, за што меў вечныя канфлікты з жонкай Тацянай Іванаўнай – дужа экспрэсіўнай, але мілейшай і даб-

рэйшай душы кабетай. Ён мог доўгімі гадзінамі нешта прыкручваць, адкручваць у дабітым да ручкі рэдакцыйным “Масквічы”, каб раз выехаць, а потым зноў пачынаць нешта прымяраць-падкручваць, вяртацца дамоў ў забруджанай, замасьленай адзежыне, чарговы раз атрымліваць ад жонкі на арэхі, якія адскоквалі ад яго, як гарох ад сьцяны. А мне дык падабалася і ягоная занятасьць, і прадастаўленая мне самастойнасьць. Бадай, нідзе і ніколі больш не працавалася так узьнёсла, з такім імпэтам, натхненьнем і самааддачай, імкненьнем самарэалізаваца, як тут. І ў калектыве, і ў раённага начальства, і ў гаспадарнікаў адчуваў да сябе добрае, прыязнае стаўленьне, быў дапушчаны да раённай кіруючай эліты ці, як сказаў сёньняшні народны класік, у “узкий круг ограниченых людей”...

У памяці захавалася шмат розных гісторыяў з тых часоў. Прыгадаю толькі адну – вясёлую і адначасова сумную пра Папялушку, якая на нейкі час стала прынцэсай, да чаго меў непасрэднае спрычыненьне...

Неяк пазваніў з райкаму рэдактар і загадаў неадкладна прабыць у кабінет першага сакратара Мікалаенкава. Падзівіўся: навошта спатрэбіўся першаму, калі там рэдактар? Але клічуць дык клічуць – завёў матацыкл і праз дзьве-тры хвіліны быў у райкаме.

У першага сядзелі заклапочана абодва сакратары Грыгор’еў і Нялюбін, старшыня райвыканкаму Апрышчанка са сваімі намесьнікамі, загадчыкі аддзелаў, інструктары, усе тры сакратары райкаму камсамолу на чале з Мішам Крупіцам ды Абрам Данілавіч.

– Такая справа... – зьвярнуўся першы ледзьве я пераступіў парог. – Ты шастаеш па калгасах, то мо ведаеш сьвінараку альбо цялятніцу, каб была да дваццаці пяці гадоў, беларуска, беспартыйная і не камсамолка, з пачатковай адукацыяй і, вядома, мела добрыя паказчыкі?.. – Мусіць, заўважыў на маім твары пытаньне і патлумачыў: – Трэба знайсьці кандыдатуру з такімі параметрамі на вылучэньне дэпутатам Вярхоўнага Савету СССР па Савеце нацыянальнасьцяў, гэта значыць – адна на пяць раёнаў. Нельга ўпусьціць, трэба знайсьці, і тэрмінова – ужо заўтра-пасьлязаўтра жывую-здаровую даставіць у абкам партыі...

– Ведаю такую, – кажу не задумваючыся. – Тыдні два назад нарыс надрукаваў. Сьвінарка з калгасу імя Куйбышава Ліда Тупік. Рабацяга – пашукаць, і ўсё падходзіць: дваццаць два гады, не камсамолка і беспартыйная, два ці тры класы адукацыі, а па нацыянальнасьці – дык там, здаецца, усе беларусы...

– А як яна ўмудрылася і сямігодку не закончыць, і па-за камсамолам застацца? – падзівіўся першы сакратар. – Калі райана кантралюе абавязковую адукацыю, а ён, – кіўнуў на Мішу Крупіцу, – усіх гамузам у камсамол прымае…

– Яшчэ дзяўчынкай памагала хваравекай маці-сьвінарцы, а потым узяла ўсе клопаты на сябе. Во так і засталася... – патлумачыў я.

– Ну, слава Богу! – узрадаваўся першы і ўзяўся званіць старшыні калгасу Гузаву. – Хай дзеўка хоць сьвет пабачыць...

Гузаў нічога канкрэтнага ня мог сказаць, апроч таго, што насамрэч ёсьць такая вельмі харошая маладая сьвінарка, пра якую толькі што надрукаваны вялікі артыкул у “За Радзіму”. Мікалаенкаў тут жа падсыпаў яму на арэхі, што ня ведае сваіх лепшых людзей і строга загадаў неадкладна ўдакладніць усе анкетныя дадзеныя і праз хвілінаў пятнаццаць далажыць яму асабіста і чакаць далейшых указаньняў...

І пайшло-закруцілася. У абкаме ўзрадаваліся, што знайшлася такая, узгаднілі кандыдатуру вышэй, загадалі: калі ня будзе заўвагаў па лініі кампетэнтных органаў, то заўтра, у крайнім выпадку з самай раніцы пасьлязаўтра даставіць пратэндэнтку з пісьмовай згодай балатавацца для гутаркі ў абкам партыі. Раённы гэбіст па сваёй лініі атрымаў звыштэрміновае заданьне, і ўжо к вечару далажыў Мікалаенкаву і, пэўна ж, свайму начальству: ніякага кампрамату на Ліду Тупік ня маецца.

Тут жа ў калгас Гузаву паступіла строгае ўказаньне: заўтра к дзевяці даставіць Ліду Тупік ў райкам партыі з гатовай пісьмовай згодай балатавацца. А позна ўвечары той страшэнна растроены апалым голасам пазваніў першаму на кватэру і паведаміў, што Ліда Тупік наадрэз адмаўляецца ад дэпутацтва. Разгневаны Мікалаенкаў на высокіх нотах загадаў Гузаву а палове дзевятай разам з прэтэндэнткай быць у райкаме…

Недзе пасьля дзесяці раніцы ў мяне раздаўся званок і Мікалаенкаў злым голасам загадаў:

– Бягом сюды! Разьбірайся са сваёй Тупік. Зьявілася, як пудзіла гарохавае ды сваёй адмовай устройвае нам палітычны скандал. Забясьпечвайце разам з Каралёвым, а я паклікаў Раева, каб тэрмінова апрануў...

Ліда ў паношанай фуфайцы і гумовіках разам з Гузавым была ў кабінеце Каралёва, вельмі ўзрадавалася, убачыўшы мяне, аднак цягнула сваю ранейшую песьню, шукаючы ў мяне падтрымкі:

– Ёсьць мне час па Масквах разьязджаць, а хто сьвіньні карміць будзе?..

Тыдні тры назад у нас з ёю была доўгая гаворка і на ферме, і ў ейнай маленькай скасабочанай хацінцы з глінянай падлогай, паўразваленай печчу, дзе жылі ўдваіх з нямоглай маці. Усё гэта я напісаў у нарысе, прысаромлюючы калгаснае кіраўніцтва, і ў той жа дзень мне пазваніў Гузаў, пакляўся, што неадкладна пашле брыгаду, якая зробіць усё як трэба. І насамрэч калгасныя будаўнікі ўзяліся ладзіць печ, вокны, дзьверы, слаць падлогу, у чым я пераканаўся, заскочыўшы па дарозе праверыць, як трымае слова Гузаў. Ліда была страшэнна рада, і цяпер Мікалаенкаву і Каралёву заявіла, што верыць толькі мне. Я “аўтарытэтна” пацьвердзіў, што будзе езьдзіць бясплатна ня толькі ў Маскву, а куды і дзе толькі захоча, хоць да Уладзівастоку, жыць і карміць у Маскве таксама будуць задарам ды яшчэ і грошы плаціць, сваімі вачамі, як тут кожнага з нас, будзе бачыць самога Хрушчова і ўсіх, чые партрэты вывешваюць на сьвяты. Яна паверыла, але страшэнна непакоілася, як даедзе да Масквы і ці ня згубіцца там, бо далей Жалудка нідзе не была. Я супакоіў, што ў Маскву дэпутаты ад вобласьці ды ад рэспублікі езьдзяць кампаніяй, не дадуць згубіцца-заблудзіцца, а як асвоіцца – пачувацца ў Крамлі і ў Маскве будзе, як у сваёй вёсцы. А пра сваіх сьвіней хай не хвалюецца – пакуль будзе ў Маскве на сесіях ці на сустрэчах з выбаршчыкамі, іх дагледзіць падменная сьвінарка, што тут жа пацьвердзіў Гузаў, заадно запэўніў, што санітарка і медсястра з фапа будуць штодня прыглядваць за хворай маці. Ліда верыла і ня верыла, аднак згоду балатавацца напісала, дакладней – перапісала з напісанага Каралёвым буйнымі літарамі, старанна і цяжка выводзячы кожную каракуліну. А на прысаромнае пытаньне, чаму, едучы ў людзі, не апранулася прыстойна, ніякавата разьвяла рукамі: няма нічога лепшага, бо і патрэбы нямашака – з відна да цямна на рабоце, не да гуляў...

Усе разам пашлі ў кабінет да першага, дзе ўжо быў вялікі, мажны дырэктар райбыткамбінату Раеў. Мікалаенкаў быў задаволены нашай з Каралёвым агітацыяй, пахваліў Ліду і загадаў Раеву:

– Стаў на вушы ўсе свае службы, каб праз тры гадзіны была апранутая з іголачкі і выглядала, як артыстка…

Раеў памуляўся, але пакорна запрасіў Ліду ісьці з ім, а тая нечакана заўпарцілася: у мне грошай няма на абноўкі...

– Ды не хвалюйся, Ліда, – супакоіў Мікалаенкаў. – За ўсё заплоціць ён, – паказаў на Гузава. – Калгас заплоціць…

Ліда зноў ударыла ў хамут, заявіўшы, што ня верыць. І зноў давялося ўмяшацца, каб пераканаць, што будзе так, як сказаў першы сакратар…

А праз гадзіны чатыры райбыткамбінатаўскія майстры і майстрыхі ў аўральным рэжыме адзелі, абулі, прычасалі Ліду – і яна насамрэч стала калі і не прынцэсай

то вельмі зграбнай дзяўчынай – проста не пазнаць. Глядзела ў люстэрка, усьміхалася сама сабе і, адчувалася, абноўкі ёй вельмі і вельмі даспадобы…

Ну а далей ператварэньне Папялушкі ў прынцэсу пайшло, як па масьле, па абкатаным сцэнары. Паездка на райкамаўскім легкавіку ў суправаджэньні загадчыка аргаддзелу ў Гродню, арганізаваны ў калгасе сход па вылучэньні з зачытваньнем напісанай Каралёвым просьценькай кароценькай прамоўкі, затым яшчэ пяць-шэсьць раз на сустрэчах з выбаршчыкамі ў розных раёнах, куды яе вазілі і адвозілі на райкамаўскіх легкавіках, а потым выбары са звычайным 99,99 працэнта вынікам. І ўжо спакойна, без сьпешкі і аўралу з самага моднага і дэфіцытнага матэрыялу пашылі ёй за казённы кошт у райбыткамбінаце ўборы на ўсе сезоны і выпадкі. Ну і нарэшце – Масква, Крэмль, дэманстрацыя рэалізаванага ленінскага запавету – кухарка, тое ж самае і непісьменная сьвінарка, засядае ў вышэйшым органе, кіруе дзяржавай...

Сустрэліся з Лідай адразу ж пасьля ейнага вяртаньня з першай сесіі. Трымалася яна куды сьмялей і ўпэўненей, чым перад ад’ездам у Маскву. Дужа пасаваў, рабіў яе значнай салідны значок дэпутата Вярхоўнага Савету ў форме чырвонага сьцягу з пазалочанай аблямоўкай на шэраватага колеру блузцы, якая была ёй вельмі да твару. У Ліды было шмат назіраньняў і ўражаньняў, і бадай, самае важнае – спраўдзілася ўсё, што я гаварыў. Ліда была амаль шчасьлівая і на разьвітаньне сказала пра сваё галоўнае адкрыццё, зробленае ў Крамлі:

– Цяпер я знаю, за што начальнікам такія грошы плоцяць – гэта ж высядзець столькі, нічога ня робячы!..

Больш мы з ёй ніколі ня бачыліся – зьліквідавалі раён, падзяліўшы паміж Лідай і Шчучынам. Калгас Куйбышава адышоў пад Ліду, а я пераехаў ў Шчучын. Праз колькі гадоў пры сустрэчы з лідскімі калегамі пацікавіўся, як там пачувае Ліда Тупік. Расказалі, што выдатна, вельмі прызвычаілася да свайго дэпутацтва, нават выступаць навучылася без паперкі. А старшыня калгасу Гузаў на сёмым небе ад радасьці: завалодаўшы Лідзіным дэпутацкім блакнотам з афіцыйным грыфам Вярхоўнага Савету СССР на кожным адрыўным лістку, ад ейнага імя штурмаваў запытамі і просьбамі высокія ўплывовыя кабінеты, і амаль заўсёды што-небудзь выцыганьваў: то новы трактар, камбайн ці аўтамашыну, то найдэфіцытнешыя ліміты на будаўніцтва, то звышпланавыя мінеральныя тукі, то новую механізацыю на фермы – ніхто ў раёне столькі не паймеў. А за чаркай любіў прыгадваць, які колісь дурань быў, падбухторваючы Ліду не згаджацца, шкадуючы грошы на ўборы...

У казцы пра прынцэсу-Папялушку непазьбежна і нястрымна наступае поўнач, у Лідзіным выпадку – сканчэньне тэрміну дэпутацтва. Двойчы ж рабіць Папялушку прынцэсай не прынята было… Расказвалі, Ліда страшэнна пакрыўдзілася, што не вылучаюць зноў, была перакананая: яе ашукваюць, падманваюць, не хацела нікому даваць веры, усё мкнулася адшукаць “таго чалавека, які жыў у Жалудку і казаў праўду”, імя і прозьвішча якога, праўда, забыла...

(…)

З пераездам у Гродна лёс падараваў мне шчасьце блізка сыйсьціся, здружыцца, пасябраваць з Васілём Уладзіміравічам Быкавым, з якім ўпершыню пазнаўся, калі ён яшчэ быў проста Васем, непрыкметным супрацоўнікам сакратарыяту “Гродзенскай праўды”, куды я прывозіў са Шчучына аператыўна вырабляць клішэ для нашай газеты. Адбылося гэта ці то восеньню 1956, ці вясною 57-га году – помню, на вуліцы было яшчэ холадна і золка. Начальства начальствам, а клішэ выштукоўвалі мажны мацак рэтушор Валодзя і худзенькі, прапахлы махоркай і едкімі растворамі цынкограф Міша – той самы Міша, чые знакамітыя афарызмы кшталту: “Не п’еш – адкуль тое здароўе”, “Зраньня выпіў – увесь дзень свабодны”, “Ходзіш цьвярозы, як дурань” заўсёды, калі быў у вясёлым настроі, любіў цытаваць на розных сябрынах ужо сусьветна вядомы Быкаў. Валодзя і Міша былі добрыя ама-

тары закласьці за каўнер, таму разам з фотакарткамі мяне ў рэдакцыі “нагружалі” парай пляшак добрай самагонкі. Ехаў звычайна пад вечар, Валодзя і Міша, ахо-даўшыся недзе ля апоўначы са сваёй газетай, браліся за мае фотакарткі, трохі “ўзяўшы на зуб”. Працэс вырабу клішэ тады быў складаны і доўгі, і мяне, каб ня тоўкся пад нагамі і не выклікаў падазрэньня, адпраўлялі спаць у кабінет адказнага сакратара Андрэя Данілавіча Коласа, дзе была шыкоўная, мяккая скураная канапа. Ня будзячы мяне, хлопцы клалі загорнутыя ў паперу гатовыя клішэ на Коласаў стол, і я ранічкой прачынаўся і непрыкметна змываўся на аўтобус.

Гаспадар кабінета з-за спазьненьня газеты часам заседжваўся, і мне нічога не заставалася, як паныла сноўдацца па горадзе. На вуліцы тады была халодная, мокрая золь, Валодзя пашкадаваў мяне і завёў пабавіць час у сакратарыят, дзе было сталоў з пяць, за якімі карпелі выпускаючы, карэктары. Па суседству з Валодзем, амаль упрытык, сядзеў і нешта пісаў маладзенькі хлопец, якога ўсе звалі Васем. Я паводзіў сябе, як мыш пад венікам, намагаючыся нікому не замінаць. Потым Вася некуды выйшаў, Валодзя паклікаў паглядзець, што зрабіў з маімі самадзейнымі здымкамі, міжволі зірнуў на суседні стол, дзе толькі што сядзеў і нешта пісаў Вася, – і быў уражаны: на аркушы зьверху было акуратна выведзена і двойчы зьвіліста падкрэсьлена таямніча-зманлівае “Апавяданьне”, а далей больш як на паўстаронкі месьціліся тры-чатыры абзацы, напісаныя акуратным, прыгожым почыркам з рэдкімі папраўкамі. Ого, падумаў з павагай, ён апавяданьні піша! Не ведаю чаму, але гэты почырк чамусьці назаўсёды ўрэзаўся ў памяць, як сёньня бачу тое падкрэсьленае “Апавяданьне” і роўненька напісаныя абзацы, але без загалоўка...

Пазнаёміліся ж з Васілём Быкавым недзе гады праз тры, як памёр Міхась Васілёк і ягонае месца літкансультанта ў аддзеле культуры заняў той самы Вася, даволі ўжо вядомы тады ня толькі на Гарадзеншчыне па публікацыях у мясцовым альманаху “Нёман”, але і ў рэспубліцы. Тады жартавалі: літаратурны сьцяг Гарадзеншчыны перайшоў ад Васілька да Васіля. Зрэдку я дасылаў ці, бываючы ў Гродне, заносіў яму свае вершы, сёе-тое ён ухваляў, даваў у друк, сёе-тое бракаваў. Канечне, назваць гэта сур’ёзным знаёмствам можна з вялікай нацяжкай, хоць ён прыязна вітаўся, пазнаваў на вуліцы, але ці мала было ў Быкава, які пасьля выхаду “Жураўлінага крыку” атрымаў усебеларускую вядомасьць, такіх, як я, паэтаў! Ды і да вершаў я стаў астываць, спаўна аддаючыся раёнцы, у няпоўныя дваццаць два гады стаўшы намесьнікам рэдактара.

Мала чым зьмяніліся нашыя стасункі і пасьля таго, як я перайшоў у “Гродненскую правду” і мы сталі, як ён казаў і нават засьведчыў на адной з падораных кніжак, “супрацоўнікамі адной газеты”. Я ня так часта бываў у рэдакцыі, ён меў ня надта жорсткі працоўны графік, падоўгу бываў у Менску, Маскве, розных паездках, у тым ліку і замежных, на здымачных пляцоўках, калі актыўна ўзяліся экранізаваць ягоныя творы, таму мы практычна ня бачыліся, хоць ён рэгулярна друкаваў мае вершы на “Літаратурных старонках». Рэдакцыйнае начальства, вядома, было не ў захапленьні ад частай адсутнасьці супрацоўніка, але ставілася да гэтага з разуменьнем. У калектыве ж было нямала зайздросьнікаў, людзей, якія ніяк не маглі зразумець і зьмірыцца, што свой непрыкметны Вася ўзьляцеў так высока – самае што ні ёсьць банальнае: ня можа быць прарока ў сваёй айчыне, тым больш – генія ў родным творчым калектыве. Найбайчэйшыя “разбойнікі пяра”, якія напаўжарт-напаўсур’ёз любілі сябе так велічаць, скептычна ўхмыляліся: ат, раздзімаюць, во разразіўся нарысам – і пшык атрымаўся. (Што праўда, то праўда: падвальны нарыс Быкава ў “Гродненской правде” пра вядомага ветэрана вайны атрымаўся кволенькім. Дарэчы, гэта была, здаецца, першая і апошняя спроба Васіля Уладзіміравіча выступіць у жанры газетнага нарысу.)

Па меры росту сваёй вядомасьці і папулярнасьці Быкаў усё больш адчуваў

сябе чужаком у калектыве, хоць паводзіў сябе гранічна сьціпла, нават, здавалася, саромеўся сваёй славы. А калі ўсё разьвярнулася на сто восемдзесят градусаў і хваласьпеў зьмяніўся шальмаваньнем, адносіны Быкава з калегамі ў калектыве яшчэ больш ускладніліся. Родную газету, якая ну ніяк не магла знайсьці дастойных крытыкаў і контрпрапагандыстаў на месцы, змушалі перадрукоўваць брудныя пагромныя пасквілі з менскіх і маскоўскіх выданьняў. Васіль Уладзіміравіч ведаў, што рэдактар Андрэй Колас ставіўся да яго, наколькі мог, лаяльна, з разуменьнем, супраціўляўся гэтым перадрукам, пераконваў сакратароў абкама, аднак гэта было малое суцяшэньне. Нікога рэдактар ня мог ні пераканаць, ні ўгаварыць – была каманда з самага верху, аж з самай першапрыстольнай, аслухацца якую ніхто ня мог. Многія ў рэдакцыі сталі асьцерагацца мець справу з Быкавым – як бы чаго ня выйшла, абыходзілі бокам, апусьціўшы вочы. Самае дзіўнае і сьмешнае: часьцей за ўсё гэта былі вядомыя рэдакцыйныя “закладоншчыкі за каўнер”, якія вельмі цанілі нескупярдзяйства Быкава і добра “бралі на халяву” за ягоны кошт. Асобныя з іх – быў такі Віктар Яркін – высоўваліся нават з крытыкай і асуджэньнем “памылак” Быкава. Але дзеля справядлівасьці трэба сказаць, што ў калектыве было нямала, нават бальшыня, я ў тым ліку, хто і ў калідорах, і ў рэдакцыйных кабінетах, і нейкіх іншых неафіцыйных абставінах абураўся, спачуваў калегу, ад шмат каго ён адчуваў адкрытую маральную падтрымку.

Недзе тыдні праз два пасьля пераезду ў Гродна пад вечар, ідучы з работы па вуліцы Савецкай, каля аблсаўпрафу напаткаў Быкава. Павіталіся. Аказалася, што ён ідзе ў Дом Ажэшкі да Карпюка і нам па дарозе. Ён павіншаваў мяне, падалося, ня без іроніі з “начальніцкай пасадай”, я абсалютна шчыра адказаў, што ня ведаю віншаваць ці спачуваць трэба, расказаў, як усё адбылося. Ён выслухаў моўчкі, сказаў задумліва і няпэўна:

– Хто яго ведае, мо гэта і добра...

Адчувалася, маё прызначэньне і зьдзівіла, і, здаецца, трохі насьцярожыла яго, бо было яно надта ж нечаканым і нелагічным: па-першае, актыўна абмяркоўваліся зусім іншыя, больш вопытная і спрактыкаваныя кандыдатуры з абласной газеты і радыёкамітэту, а па-другое... Яшчэ не забылася, што ня так даўно ў дакладзе на абласной ідэалагічнай нарадзе з удзелам творчай інтэлігенцыі мяне ў зьвязцы з Карпюком і Быкавым жорстка раскрытыкавалі за ”очернение социалистической действительности”, якое ўгледзелі ў напісаным вершам фельетоне ў воранаўскай раёнцы. Я быў малады, гарачы – ня сьцерпеў, папрасіў слова і даў рашучы адлуп ня толькі той крытыцы, але і нагаварыў яшчэ воз “крамолы”: пры цары і то прасьцей было маладым аўтарам надрукавацца, выдаць кніжку, а тут быў альманах “Нёман” – і невядома чаму закрылі, пры панскай Польшчы толькі ў Гродне, ня кажучы пра Вільню, выходзіла чатыры ці пяць газетаў па-беларуску, а зараз няма ніводнай.-..Канечне ж, у заключным слове мяне “паправілі”, пасьля чаго можна было лічыць, што на маёй журналісцкай кар’еры пастаўлены крыж... А тут гэткі нечаканы кульбіт: узялі на працу ў абкам загадчыкам сектару друку... Праўда, ні Быкаў, ні хто іншы ня ведаў, што пасьля той нарады паклікаў мяне сакратар абкаму Ульяновіч і, не заходзячы ў кабінет, у калідоры амаль прыязна, але па-бацькоўску строга сказаў: “Ты – нармальны і таленавіты хлопец і мая табе парада – ніколі ня лезь на ражон з адкрытым забралам, бо так можна і шыю зламаць. Зразумеў?”.. Тады зразумеў толькі адно: мусіць, пранесла...

Многія чакалі, дый сам Васіль Уладзіміравіч па натуры ніколі ня быў вялікім аптымістам, што чэхаславацкія падзеі нададуць новае дыханьне антыбыкаўскай кампаніі, якая і без таго ўдосталь напсавала яму крыві і нерваў; і ён усур’ёз стаў падумваць аб пераезьдзе ў Вільню, куды клікалі літоўскія сябры: Прыбалтыка ёсьць Прыбалтыка... Аднак, мусіць, заўсёды ўсялякая кампанія разьвіваецца па сваіх

унутраных законах: нараджаецца, разьвіваецца, дасягае кульмінацыі, ідзе на спад, канае, ператвараецца ў сваю супрацьлегласьць. Іншага лёсу не магло быць і ў кампаніі па шальмаваньню Быкава. К таму часу, калі воляю выпадку ці лёсу я апынуўся ў абласных калідорах улады, яна ўжо выдыхалася, набывала камічна-фарсавыя адценьні і нават ідэалагічна вострыя чэхаславацкія падзеі ўжо ня ў стане былі надаць ёй новае дыханьне... Першае, што мяне ўразіла: у абкаме ніхто, за выключэньнем хіба некалькіх састарэлых артадоксаў з парткамісіі, усур'ёз ворагамі, ідэалагічнымі дыверсантамі Быкава і Карпюка не лічыў. Ні Грышкевіч, ні Ульяновіч, ні Мікуловіч. Дзіўна тады: чаму на кожным пленуме абкаму, гаркаму, райкаму, кожным партгасактыве, кожнай нарадзе, незалежна, што на іх абмяркоўваецца, пляжаць Карпюка і Быкава? Карпюк заўсёды фігураваў першы, паколькі быў членам партыі і з яго больш патрабавалі, хоць амаль усе прэтэнзіі тычыліся твораў Быкава. Было ўражаньне, што гэта ледзь ці ня нейкае заклінаньне, шаманска-рытуальнае дзейства. І па лініі партыі, і па лініі Саветаў, камсамолу, прафсаюзаў... І яшчэ ў мяне, сьвежага чалавека, было ўражаньне, што ўсе разумеюць недарэчнасьць гэтага дзейства, але ніхто не рашыцца перапыніць яго...

Рыхтаваўся пленум па сельскай гаспадарцы, дакладней – пленум па выкананьні рашэньняў чарговага пленуму ЦК КПСС. Пасьля таго, як першаму сакратару абкамуМікуловічу спадабаўся падрыхтаваны мною тэкст пасланьня нашчадкам, якое ён зьбіраўся закласьці ў капсулу на Кургане славы з наказам ускрыць у сотыя ўгодкі Вялікага Кастрычніка, а таксама ягонага артыкулу для "Полымя" без адзінай заўвагі і паправачкі, ён распарадзіўся, каб усе падрыхтаваныя яму даклады і ягоныя выступленьні на пленумах, розных іншых важных мерапрыемствах у Менску і Маскве чытаў і правіў я. Загад першага ёсьць закон, і нават член бюро загадчыца арганізацыйна-партыйнага аддзелу Чагіна, заўсёды трохі ніякавеючы, прыносіла на чытку і праўку матэрыялы для Мікуловіча. Дык вось загадчык сельгасаддзелу Рэпкін напярэдадні пленуму прынёс мне сельскагаспадарчы даклад на старонак 60, у якім пасьля праблемаў штучнага асемяньненьня кароў і пастаноўкі задачаў агітатарам, лектарам, рэдакцыям газетаў і радыё па прапагандзе перадавога вопыту – як заўсёды, два абзацы прыкладна такога сэнсу: у той час, як пад кіраўніцтвам мудрай ленінскай партыі калгаснае сялянства ардэнаноснай Гарадзеншчыны праяўляе небывалы гераізм і працоўны энтузіязм, так званыя пісьменьнікі Карпюк і Быкаў сеюць песімізм і нявер'е ў стваральную сілу і высокі маральны дух будаўнікоў камунізму, займаюцца ачарніцельствам, льюць ваду на млын нашых ворагаў і г.д і т.п.

Во напісаў і падумаў: да якога ж сьмяхоцьця, да якога маразму даходзіла тая антыбыкаўская кампанія! І міжволі прыйшло параўнаньне з апошняй, рэанімаванай больш чым праз трыццаць гадоў тымі ж пабітымі мольлю, але з брэндамі "сучасныя паліттэхнолагі" людзьмі адносна ўжо сусьветна вядомага, Народнага, адзначанага самымі высокімі ўзнагародамі і рэгаліямі Быкава, што змусіла старога, хворага чалавека пакінуць родны кут і чэзнуць на чужыне. У несусьветнай лухце, якую гналі тады, у шасьцідзясятыя гады, на Быкава, можна было ўгледзець хоць нейкі, хоць у самым зародку пробліск хай сабе і скажонай, але нейкай логікі з прыкметамі інтэлекту. А паспрабуй адшукаць хоць самыя што ні ёсьць кволенькія праблескі інтэлекту, тым больш элементарнай логікі ў аўтараў лухты кшталту: "Гэта ня той Быкаў. Таго Быкава, удзельніка вайны, выкрала амерыканская разьведка, калі служыў на Далёкім Усходзе, і падмяніла сваім шпіёнам, у задачу якому паставіла ўзарваць наш лад знутры..." Гэткую чысьцейшай вады шызафранічную туфту на пачатку 21-га стагоддзя на паўнейшым сур'ёзе гнала ў эфір дзяржаўнае радыё... Не заўсёды, аказваецца, розум, у тым ліку і дзяржаўны, разьвіваецца па дыялектычнай сьпіралі...

Рашуча выкрасьліў з дакладу тыя два “карпюкоўска-быкаўскія” абзацы, даправіў з улікам Мікуловічавых стылёвых схільнасьцяў тэкст да канца, аддаў Рэпкіну і стаў чакаць, якая ж будзе рэакцыя. Той пайшоў удакладняць пазіцыю майго шэфа – загадчыка аддзелу прапаганды і агітацыі Грышкевіча, але асьцярожны і хітраваты Анатоль Аляксандравіч ухіліўся ад прамога адказу, паслаў яго да Мікуловіча: ён дакладчык, хай сам і вырашае... Далажылі першаму. Той паклікаў мяне, нахмурыўся, спытаў строга:

– А чаго ты крытыку Карпюка і Быкава выкінуў?

– Якая ж гэта крытыка, Іван Фёдаравіч? Ды ўсё гэта падобна на конскае брыканьне. Колькі ж можна выстаўляцца людзям на сьмех!..

Першы паглядзеў уважліва, падумаў і нечакана сказаў:

– Ладна, і праўда, ляганьне... Ты і з майго выступленьня ў ЦК выкрасьлі таксама...

Адсутнасьць у дакладзе нават упамінку Карпюка і Быкава ў чыноўнага люду выклікала лёгкае зьдзіўленьне і ўспрынята... У чым-чым, а ў такой справе спрактыкаванаму, чуйнаму на павевы і нюансы ў настроях начальства чынавенству ня трэба паўтараць, разжоўваць, даказваць – усё хапае на лёце. І я з усьмешкай назіраў, як вопытныя выступоўцы з райкамаў, райвыканкамаў, вучоныя-аграрыі, нават разумныя старшыні калгасаў пачалі сьпешна выкрэсьліваць са сваіх тэкстаў абзацы. Карпюка і Быкава па-ранейшаму грамілі толькі радавыя прадстаўнікі калгаснага сялянства, выступленьні якім, звычайна, рыхтавалі інструктары райкамаў партыі і выступоўцы мелі строгае ўказаньне: ні на слова не адступаць ад тэксту...

З таго пленуму ў вобласьці фактычна спынілася дурная рытуальна-шаманская сьвістапляска вакол пісьменьнікаў. І на рэспубліканскім пленуме было заўважана і ўспрынята адпаведным чынам выступленьне гарадзенскага першага...

Не хачу прыпісваць сабе нейкія асаблівыя заслугі, проста – спантанна, кіруючыся здаровым сэнсам, не пасьпеўшы добра ўведаць чыноўныя прамудрасьці, згодна якім высоўвацца з падобнага кшталту ініцыятывамі рызыкоўна і небясьпечна, па сваёй наіўнасьці патрапіў у самую кропку, зрабіў тое, да чаго ўжо было гатова начальства. Гэта праз гады пацьвердзіў мне і сам Мікуловіч, калі прыгадваў той выпадак з хітраватай усьмешкай:

– А я і ведаў, што ты выкінеш... Думаеш, мне не дакладвалі, што ты яшкаешся з Быкавым?

Мяне гэта страшэнна ўразіла. Паашываўшыся трошкі ва ўладных калідорах, многа чаго пабачыўшы, тым ня менш я ня мог і думкі дапусьціць, што тады ў Гродне за Быкавым так пільна сачылі і дакладвалі на самы верх, хто з ім сустракаецца і, пэўна ж, якія гаворкі вядзе... І прыгадалася, як неяк у тыя часы Васіль Уладзіміравіч са шчырай заклапочанасьцю запытаўся, ці не баюся я гэтак адкрыта, на людзях сустракацца з ім? Я недаўменна і абсалютна шчыра зьдзівіўся: а што тут страшнага і незаконнага – мы ж ня змову супроць Савецкай улады ўчыняем? Ён нічога не сказаў, толькі ўсьміхнуўся неяк сумна і трохі загадкава.

Па сваёй наіўнасьці я тады не даваў веры Быкаву, што да яго гэтак па-дурному чапляецца цэнзура. У мяне ў сейфе быў той знакаміты сакрэтны “Перечень” – салідны фаліянт, змацаваны пячаткай і подпісам галоўнага маскоўскага “літчыка”, дзе тое, што забаронена друкаваць, даходліва і акуратна раскладзена па палічках, а ўсе аператыўныя зьмены прыкладваліся на асобных паперках з той жа пячаткай і тым жа подпісам. Таго, за што, па словах Быкава, чапляліся да яго, ні ў “Перечне”, ні ў ягоных дадатках і блізка не было. Васіль Уладзіміравіч толькі ўсьміхаўся маёй наіўнасьці, а я паверыў значна пазьней, калі самому давялося сутыкнуцца... Аказалася, “перечень перечнем”, а “літаўскія” жанчынкі, кіруючыся нейкім іншым, тайна спушчаным ім “перачнем”, праяўляюць куды большую ідэйную вытрымку і рэвалюцыйную пільнасьць, чым аўтар, які ў Маскве стацыянарам з чырвоным дыпло-

мам закончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС і займае пасаду загадчыка сектару ЦК. Ды што казаць пра мяне ці Быкава, калі яны "літавалі" нават самога Машэрава. Насамрэч нейкая д'ябальская сіла стаяла за гэтымі "літаўскімі" жанчынкамі...

Памаленьку, са скрыпам ня толькі ў Гродне, а і ў Менску пасьля рашучых пісьменьніцкіх выступленьняў у абарону Быкава кампанія па цкаваньні пісьменьніка губляла энергію, глухла, выраджалася, хаця сям-там па інерцыі адыёзныя артадоксы і форменныя прыдуркі працягвалі "бараніць сьвяшчэнныя прынцыпы сацрэалізму ад Быкава і яму падобных". Аднак гэта быў ужо фарс. Быкава на нейкі час пакінулі ў спакоі, бы забыліся, потым сталі зьяўляцца стрымана-асьцярожныя артыкулы, у якіх ужо была спроба аб'ектыўна прааналізаваць ягоныя творы, ягоныя філасофскія, этычныя і эстэтычныя прынцыпы. Тым больш, што была добрая зачэпка для такой гаворкі і сур'ёзнага аналізу – амаль штогод і ў арыгінале, і ў перакладзе на рускую мову выходзілі ў Менску ў "Маладосьці" і ў Маскве ў "Новом мире" новыя аповесьці Васіля Быкава, якія заўсёды мелі шырокі чытацкі розгалас.

А потым... А потым паступова і, канечне ж, заканамерна антыбыкаўская кампанія паціху-памалу пераходзіла, праз няпоўныя два гады перайшла ў сваю супрацьлегласьць. Спакваля, нясьмела, бы вінавацячыся перад пісьменьнікам, сталі гаварыць, пісаць пра станоўчае ў ягонай творчасьці, а неўзабаве ўсё тое, што яшчэ зусім нядаўна шальмавалася, пачало прызнававцца, падавацца як сьмелае наватарства, як найвялікшае дасягненьне Быкава-празаіка. І гэта была праўда. Аднак, як заўсёды ў нас, не абыходзілася без шараханьняў у крайнасьці, перасолаў і перасалодаў, казённай алілуйшчыны, якая так цешыць вушы і душы абласканых уладай творцаў, а сьціпламу, цкаванаму гэтулькі год уладамі і аглабельнай крытыкай Васілю Уладзіміравічу ад гэткай увагі і хваласьпеваў часта хацелася скрозь зямлю праваліцца. Пра гэта ён з поўнай шчырасьцю сказаў у "Доўгай дарозе дадому", апісваючы свой душэўны стан на ўрачыстым сьвяткаваньні пяцідзесяцігадовага юбілею ў Гродне. Я назіраў за ім тады з сярэдзіны вялізнай залы самага сучаснага і раскошнага на той час Палацу хімікаў. Што я толькі-толькі вярнуўся з Масквы і знаходжуся ў зале – ён і не здагадваўся. Рабіў спробу раніцой пазваніць, павіншаваць, але марна. Мы даўнавата ня бачыліся, я ня мог не прыйсьці на ягоны вечар, пра які даведаўся з абвесткі, як толькі ступіў на прывакзальную плошчу. Шчыра кажучы, было вельмі цікава на свае вочы пабачыць, як адаптуецца ён да грамадскай увагі, да свайго заслужанага прызнаньня, парадавацца за яго. Ад хлопцаў даведаўся, што Быкаў, як толькі мог, упарціўся, адбіваўся ад грандыёзнага публічнага сьвяткаваньня, але не ўстаяў пад напорам абкама, менскіх сяброў, а перш за ўсё Карпюка, які зрабіў сваёй вялікай саюзьніцай жонку Васіля Уладзіміравіча Надзею Андрэеўну.

Гэта быў першы ягоны выхад на такую агромістую аўдыторыю. Кідалася ў вочы, што ў вялізным з пазалотаю крэсьле, падобным на царскі ці каралеўскі трон, у якое ўсадзілі яго на сцэне, ды яшчэ пад уласным партрэтам юбіляр пачувае сябе дужа няўтульна. Ён то здымаў, то навешваў акуляры, то вымаў, то зноў клаў у бакавую кішэню нейкія складзеныя папалам паперкі.

Даклад Алеся Адамовіча, які сьпецыяльна прыехаў з Менску расказаць гарадзенцам, хто такі Быкаў, Васіль Уладзіміравіч выслухаў даволі спакойна, нават абыякава, толькі сяды-тады, калі дакладчык даваў надта ж ужо нязвыкла-высокія, падобныя на лёсткі ацэнкі, круціўся на тым крэсьле, як на гарачай патэльні, усё больш змрачнеючы. А як пачаліся доўгія, падобныя на панегірыкі па нябожчыку, віншаваньні ад рабочага класу, калгаснага сялянства, працоўнай інтэлігенцыі, моладзі і студэнцтва, зачытваньне прывітальных адрасоў ад розных арганізацыяў і працоўных калектываў, панурыў галаву і глядзеў у адну кропку, уцягнуўшы шыю

ў плечы, быццам яго ня славілі на ўсе лады, а лупцавалі бізунамі. Ну і калі прарэктар педінстытуту прафесар Барыс Фіх усім даў фору, заявіўшы пад апладысьменты залы, што ў Гродна, як і ў Ясную Паляну да магілы Талстога, будуць езьдзіць пілігрымы з усяго сьвету, здалося, што юбіляру хочацца залезьці пад столік, які стаяў перад ім. Нарэшце, больш чым двухгадзіннае выпрабаваньне дыфірамбамі скончылася і пад апладысьменты далі слова юбіляру. Неяк нязвыкла сутуліўшыся, Быкаў падыйшоў да мікрафону, выняў з бакавой кішэні напісаны тэкст, здранцьвелым голасам прачытаў першы абзац, мусіць, зразумеў, што гэта зусім ня тое, што трэба гаварыць у такой сітуацыі, адарваўся ад паперкі, склаў яе і сунуў у кішэнь, падзякаваў прысутным за тое, што прыйшлі, сказалі добрае слова, пакланіўся зале – на тым і закончылася першая ўрачыстая частка...

Прывыкаў ён да сваёй славы, дакладней – непазьбежных атрыбутаў і ўмоўнасьцяў па абслугоўваньні яе, цяжка і пакутліва, здаецца, так і не прывык да канца дзён сваіх. Канечне ж, ён ведаў сабе цану і самыя высокія прэміі, званьні, узнагароды, іншыя знакі ўвагі прымаў як належнае, як заслужанае, але ніколі, ні пры якіх абставінах не дазваляў сабе, як гэта рабілі многія, шукаць нейкія крывыя сьцежкі, каб атрымаць яшчэ адзін знак увагі. Ён быў горды і адначасова абсалютна просты, даступны чалавек, арганічна не выносіў пыхі, фанабэрыі, гульні ў геніяльнасьць. Я ня ведаю ніводнага чалавека, хто выстаўляў напаказ сваю нібыта абранасьць і геніяльнасьць, з кім таварышаваў Быкаў, але ведаю нямала блізкіх ці сімпатычных яму людзей, з якімі разыходзіўся рашуча і беззваротна, як толькі тыя захворвалі на фанабэрыю і месіянства, хваробу, якую мы ўжарт назвалі іменем аднаго вядомага літаратара, які сваім галоўным недахопам лічыў няўменьне пісаць кепска і, калі даймалі зайздросьнікі, нібыта сьпецыяльна пачынаў шрайбаць левай нагою, як усе, але прачынаўся раніцай, перачытваў – і атрымлівалася, што напісанае зноў геніяльнае. Жарт жартам, але гэтая хвароба, як іржа, разьядала і разьядае многія пісьменьніцкія душы. У Быкава да гэтага “ізму” быў абсалютны імунітэт, катэгарычны маральны імператыў, які, чаго там хаваць, нярэдка ўскладняў і без таго няпростае ягонае, у тым ліку і асабістае, жыцьцё. Так, па вялікім рахунку Быкаў быў чалавекам прынцыпу, але калі казаць па шчырасьці, не заўсёды яму хапала прынцыпу і мужнасьці пасылаць к чортавай матары людзей яму несімпатычных, што заўсёды таўкліся-круціліся каля яго, цану якім ён выдатна ведаў. Нейкі ледзь ні гіпертрафіраваны душэўны такт замінаў яму некаму ў нечым адмовіць, праз што часам трапляў у складаныя, нават камічныя сітуацыі. Асабліва напачатку сваёй славы. Прыгадваецца, як пасьля адзначэньня юбілею на афіцыйным узроўні з узнагароджаньнем трэцім па рангу ордэнам напісаць, зьняць на кіна- і відэа стужку Быкава, узяць інтэрв’ю ў нядаўна апальнага пісьменьніка захацелі сотні айчынных і замежных тэле-радыёкампаніяў, студыяў кінахронікі, рэдакцыяў газетаў. Яму званілі, дамаўляліся, а то і без усялякай дамовы (падумаеш, правінцыя!) ехала ў Гродна Бог ведае адкуль пішучая і здымаючая брація. Яму, негаваркому па натуры, трохі каснаязыкаму кожнае інтэрв’ю, асабліва відэазапіс даваўся надзвычай цяжка, патрабаваў душэўных сілаў і часу. Словам, для Васіля Уладзіміравіча пачаўся суцэльны кашмар. Не падымаў тэлефонную трубку, прасіў жонку казаць, што яго няма дома і невядома, калі будзе, прыкідваўся хворым, але ня так проста ўлізнуць ад вопытных “акулаў пяра”. Хаваўся ў сяброў, выязджаў на прыроду. Але ж трэба было карпець над новай аповесьцю, а пісалася толькі за сваім сталом.

Неяк пад вечар Быкаў пазваніў мне і папрасіў тэрмінова сустрэцца. Ён быў змрочны, здавалася, аж учарнеў, нават схуднеў за тыя тыдні два-тры, як ня бачыліся. Неяк асуджана сказаў, што ўспамінае, як рай нябесны, часы, калі яго лупцавалі з усіх бакоў: тады хоць можна было працаваць, а зараз няма ніякага ратунку ад розных інтэрв’юераў, распытвальшчыкаў, здымальшчыкаў, запрашальшчыкаў. З ранку да позьняга вечару – і ніякага канца не відно...

– А што рабіць, Васіль Уладзіміравіч? – пажартаваў я. – Як кажуць, цярпі Зося, так прышлося – слава, як і прыгажосьць, патрабуе ахвяраў... – І дадаў сур'ёзна: – Ды пасылайце вы сяго-таго к чортавай матары...

– Яно, канечне, так... – згадзіўся Быкаў і замоўк. Адчувалася, у яго ёсьць нейкая справа-просьба да мяне. Ён не любіў такіх спраў, зьвяртаўся толькі ў крайнім выпадку, пры гэтым пачуваў сябе заўсёды нейк вінавата, бы намерваўся ўзваліць на цябе свае нямаведама якія цяжкія клопаты. Пасьля паўзы сказаў: – Слухай, а ці ня мог бы ты памагчы мне па-сяброўску адбівацца хоць ад самых нахрапістых пранырaў? – І злавіўшы мой трохі зьдзіўлены погляд, патлумачыў: – Ня будзеш вельмі супраць, калі жонка званкі пачне скіроўваць на цябе? А ты сам рашыш, каго варта ўважыць, каго – ты ведаеш куды пасылаць... Дый з тваёй пасады лягчэй адганяць ...

Канечне ж, я ня мог адмовіць Васілю Уладзіміравічу і, пэўна, месяцы два-тры, пакуль трошкі не ўляглося, выконваў абавязкі "дыспетчара-рэгуліроўшчыка" ў ягоных стасунках-дачыненьнях з прэсай і грамадскасьцю. Ды і пасьля даводзілася ня раз рашуча аберагаць занятага творчай справай пісьменьніка ад занадта рашучых і назойлівых аматараў "пакалякаць" з Быкавым ці займець яго ў якасьці вясельнага генерала. Ён ведаў гэта і заўжды плаціў удзячнасьцю.

Мяне заўсёды зьдзіўляла, як Быкаў пры сваёй сусьветнай вядомасьці, з кім лічылі за гонар сустрэцца-пазнацца найслыньнейшыя людзі нашага часу, змог застацца такім жа сьціплым, далікатным, уважлівым, простым у абыходжаньні, якім быў у тыя "гарадзенскія" часы, калі яшчэ ня ўведаў слодычы і горычы славы. Хіба толькі з гадамі стаў мудрэйшым, стрыманейшым, памяркоўнейшым, навучыўся дароўваць людзям шмат што з таго, чаго нізашто не дараваў бы ў маладосьці, стаў глядзець на сьвет, на людзей, нейкія іхнія слабасьці вачыма мудрага філасофа – трошачкі паблажліва, трошачкі з разуменьнем. Канечне ж, прайсьці выпрабаваньне гэтакай славай і застацца самім сабой магла толькі Асоба, цэласны ва ўсіх сваіх супярэчнасьцях характар, з высокім духоўным стрыжнем характар, які ўзрос на спрадвечнай сялянскай мудрасьці, беларускай ментальнасьці і меў той перасьцярагальны механізм, што дазваляў яму з гонарам і годнасьцю абмінаць тысячы спакусаў, дапамагаў і разумную, заслужанаю пахвалу, і дылетанскія, часам прыдуркаватыя дыфірамбы, і нават выпады зласьліўцаў успрымаць як нешта фатальна-непазбежнае, да тых і іншых ставіцца з пэўнай іроніяй, не зважаць і не абвяргаць, незалежна ад каго яны сыходзяць, нават калі і ад блізкіх людзей, паводзіць сябе абсалютна абыякава, быццам усё гэта ня мае ніякага дачыненьня да яго, звычайнага жывога чалавека па імені Васіль Быкаў. Ён і ў Гродне, калі яшчэ ня быў такім знакамітым, і ў Менску на вяршыні сваёй славы не любіў і, як мог, пазбягаў выстаўляцца ў цэнтр увагі, на першыя ролі, весьці рэй, нават тады, калі рабіць гэта было амаль немагчыма, як, напрыклад, на ўласных днях нараджэньня, вечарынах з нагоды прысваеньня Героя працы, званьня Народнага пісьменьніка, Ленінскай прэміі і г.д., дзе рэй звычайна вёў востры на язык Генадзь Бураўкін, часам ня надта цырымонечыся перапыняў, падпускаў віноўцу урачыстасьці кепікі, іншы раз і добранька падперчаныя, і той першы сьмяяўся, ніколі ня крыўдзіўся, любіў яго яшчэ больш як родную душу. У любой бяседзе ён неяк неўпрыкмет умудраўся сьціпла адыходзіць у цень, дзе адчуваў сябе натуральна і больш камфортна.

Разам з тым пры ўсёй сьціпласьці, абсалютна натуральнай простасьці і даступнасьці ў абыходжаньні з людзьмі ў ім была нейкая незразумелая ўнутраная сіла, якая ўтрымлівала, не дазваляла нават блізкім сябрам гэтак па-просту, запанібрата паляпваць яго па плячы, а я дык і ня змог перайсьці з ім на "ты", хоць ня раз і ў Гродне, і ў Менску, ён настойваў, патрабаваў, нават злаваўся, пагражаючы, што і ён да мяне "завыкае" афіцыёзна, але я яго лавіў на слове:

– А вы хіба “тыкаеце” старэйшым па ўзросьце Танку, Брылю, Панчанку, нават амаль равесьніку Шамякіну?

– Ага, так... Ну да-а... – неяк скрушліва ўсьміхаўся Васіль Уладзіміравіч. – Ды, так сказаць, я не гаджуся ва ўзорна-паказальныя, з якіх варта рабіць жыцьцё, так сказаць, браць прыклад...

Цяжэй за ўсё напачатку яму давалася тое, чаго не ставала ці не было ў характары, чаго трошкі не дадала прырода – ну ніяк ён ня ўмеў выступаць: хваляваўся, губляўся, зьбіваўся, часам увогуле ня ведаў, што гаварыць. А яго запрашалі ў розныя аўдыторыі, хацелі бачыць, хацелі слухаць, і ён разумеў, што бяз гэтага ну ніяк не абыйсьціся, асабліва, калі ўзначаліў абласную пісьменьніцкую арганізацыю. Ён па-добраму зайздросьціў Карпюку, які трымаўся ў любой аўдыторыі, як рыба ў вадзе. Таго хлебам не кармі, а дай трыбуну. Гэта пасьля Васіль Уладзіміравіч сваім ня надта пастаўленым, глухаватым, манатонным голасам умеў гадзінамі заварожана трымаць тысячныя аўдыторыі, ды так, што муха праляціць – чутно. А тады самае што ні ёсьць ардынарнае выступленьне дзе-небудзь перад вучнямі і настаўнікамі патрабавала ад яго неймаверных душэўных высілкаў. Неўзабаве ён даўмеўся напісаць прыдатны для любой аўдыторыі выратавальны тэкст хвілінаў на пятнаццаць – аб Гарадзеншчыне літаратурнай, пачынаючы ад Адама Міцкевіча, канчаючы Юркам Голубам і Валянцінам Блакітам. Цікавае пачыналася толькі тады, калі задаваліся нейкія вартыя ўвагі пытаньні, і ён абсалютна шчыра і адкрыта пачынаў адказваць, нікольkі не клапоцячыся, што яго ня так могуць зразумець, ня так успрыняць. Ён агарошваў аўдыторыю, заяўляючы, што яму не падабаюцца ледзь ці ня ўсе фільмы па ягоных творах, а больш за ўсё – “Альпійская балада”, што ён ня любіць тэатр, што для яго найлепшая музыка – цішыня, уяўленьня ня мае, што такое каханьне і г.д. Праз некаторы час ён выкінуў тую выратавальную паперчыну, на ўласным вопыце зразумеўшы: ня мае асаблівага значэньня, ***як*** сказаць, важней за ўсё – ***што*** сказаць. А сказаць ***што*** – у яго заўсёды было...

Мы тады даволі часта езьдзілі разам па вобласьці, і я шчыра радаваўся, што з кожным выступленьнем Васіль Уладзіміравіч набывае ўпэўненасьць, без аніякіх аратарскіх прыёмаў заваловдае любой аўдыторыяй. Здаецца, менавіта ў гэты час нашы добрыя, цёплыя таварысцкія адносіны перарасьлі ў прыязныя, сяброўскія. Спрыялі таму і нашы агульныя службовыя інтарэсы – працуючы намесьнікам загадчыка аддзелу прапаганды і агітацыі абкаму, я курыраваў аддзяленьне Саюзу пісьменьнікаў, якое ён узначальваў, і нейкім чынам творчыя: я пачаў актыўна пісаць апавяданьні і гумарэскі, якія ахвотна друкаваў “Вожык”, і неўзабаве выдаў іх асобнай кніжачкай.

– Ага, аказваецца, мы з табой пачыналі, так сказаць, аднолькава, – шчыра павіншаваў ён. – Мая ж першая кніжка таксама выйшла ў “Бібліятэцы Вожыка”...

Я гэтага ня ведаў, быў вельмі зьдзіўлены, што пра тое нідзе ніхто не пісаў, першай кнігай Васіля Быкава лічылі “Жураўліны крык”. Аказваецца, ягоная сатырычна-гумарыстычная кніжачка “Ход канём” выйшла таксама ў 1961 годзе, але трошачкі раней.

– Ну, а цяпер, так сказаць, за табою аповесьць... – зусім сур’ёзна і зычліва сказаў ён.

Неўзабаве і насамрэч напісалася першая аповесьць “Час прылёту жураўоў”, ухваленая Васілём Уладзіміравічам і надрукаваная ў “Маладосьці”. Так што Быкаў, можна сказаць, быў маім “ стариком Державиным”. А потым даваў рэкамендацыю ў Саюз пісьменьнікаў, прадстаўляў у “Литературной газете,” напісаў прадмову для першай кніжкі ў перакладзе на рускую мову, што выходзіла ў маскоўскім выдавецтве “Молодая гвардия”.

Сустракацца мы сталі даволі часта – і па справе, і проста так, пасядзець-пагаманіць за чаркаю ці ў яго, ці ў мяне, ці дзе-небудзь на “нейтральнай” тэрыторыі, каб

не рабіць лішніх клопатаў жонкам. Часам заседжваліся дапазна і ён заставаўся начаваць у мяне, ледзь сьвет прачынаўся і званіў Надзеі Андрэеўне, каб не хвалявалася, атрымліваў на арэхі па тэлефоне, цяжка ўздыхаў і пакорна ішоў “здавацца”.

У адрозьненьне ад Карпюка ён не любіў хадзіць па начальстве, нават у памяшканьне абкаму заходзіў надзвычай неахвотна. Звычайна, званіў і далікатна пытаўся: “Ты калі будзеш выходзіць з работы?” Гэта значыла, што яму нешта трэба абгаварыць. Сустракаліся часьцей за ўсё ля выхаду з абкаму на Замкавай, калі спрыяла надвор’е – спускаліся па сходках да Нёману, гулялі па набережнай, абмяркоўваючы нейкія пытаньні – ці то арганізацыю сустрэч харошымі хлопцамі з Менску, што маюць намер прыехаць у Гродна групай альбо паасобку, ці прыняць нейкую замежную пісьменьніцкую дэлегацыю, ці абгаварыць нейкія дэталі па арганізацыі дзён беларускай літаратуры, якія мы рэгулярна праводзілі ў вобласьці, ці проста так, пагаманіць, абмяняцца нейкай цікавай для нас абодвух інфармацыяй. Калі ў мяне не было неадкладных службовых спраў і ў яго быў настрой трохі адарвацца ад пісьмовага стала, дамаўляліся выехаць у людзі. Я сазваньваўся з нейкім раёнам, выклікаў з абкамаўскага гаража машыну...

Быў не адзін дзесятак такіх паездак – і на літаратурныя вечары-сустрэчы, і на запросіны пабываць на нейкіх мерапрыемствах, як адкрыцьцё партазанскіх зямлянак у Ліпічанскай пушчы, нейкіх зьвязаных з вайной помнікаў і памятных знакаў, раённыя сьвяты і фестывалі, і проста адпачыць-пагасьцяваць. Васіль Уладзіміравіч нейк адразу ж сыходзіўся з многімі першымі сакратарамі райкамаў, зачароўваў іх дэмакратычнасьцю, простасьцю, даступнасьцю, уменьнем і пажартаваць, і падтрымаць любую гаворку, і чарку ўзяць, не трацячы розуму. Ня раз яны мне, як калегу, казалі з захапленьнем пра Быкава: во мужык!

Мы мелі моду па дарозе зьвярнуць дзе-небудзь з трасы, дабрацца да нейкай забытай Богам і начальствам вёсачкі, пагутарыць з тамтэйшымі дзядзькамі і цёткамі, а потым выкласьці пачутае і ўбачанае раённаму начальству, якое пачувала сябе страшэнна няёмка ня столькі перада мною, як прадстаўніком вышэйстаячай інстанцыі, колькі перад пісьменьнікам Быкавым, які можа ўставіць убачанае і пачутае ў свой новы твор ці якае выступленьне ў прысутнасьці высокага начальства, “зьняславіць” на ўвесь сьвет, таму клялося тут жа неадкладна накруціць каму трэба хваста, выправіць становішча. Я намякаў, што праз нейкі месяц мы можам прыехаць і праверыць, на што Васіль Уладзіміравіч згодна, хітравата падміргваючы, хітаў галавою: “ Ну да...” Так што гэтыя паездкі часам прыносілі практычную карысьць ня толькі нам, але і простым людзям. Гэтая карысьць асабліва была відавочнай пры падрыхтоўцы і правядзеньні масавых літаратурна-мастацкіх мерапрыемстваў, калі ва ўсе раёны вобласьці выязджалі вялікія групы найбольш вядомых беларускіх пісьменьнікаў, якія дабіраліся да самых аддаленых вёсак. Усё гэта рыхтавалася на ўзроўні абласнога кіраўніцтва, кіраўнікоў гарадоў і раёнаў, як сапраўднае сьвята. Да прыезду пісьменьнікаў мясцовае начальства, каб ня ляснуць тварам у гразь, шмат што рабіла па ўладкаваньню быту людзей, навядзеньні парадку ў клубах, бібліятэках, школах, добраўпарадкаваньні гарадоў і вёсак. Памятаю, пасьля сьвяткаваньня стагоддзя Цёткі, якое па прызнаньні кіраўнікоў Саюзу пісьменьнікаў было першым такім цёплым, шчырым і маштабным народным сьвятам, прысьвечаным беларускаму літаратару і беларускай літаратуры, да нас з Быкавым падыйшоў старшыня мясцовага калгасу (здаецца, ягонае прозьвішча было Вітко) і сказаў: “Усе нашы людзі, і я ў першую чаргу, у пояс кланяемся і Цётцы, і вам, і ўсім беларускім пісьменьнікам, бо шчыра скажу: не дакумекаў бы, рукі не дайшлі б навесьці парадак у вёсках, адрамантаваць хаты і платы, увогуле глянуць на сябе крытычна наконт культуры”. Я бачыў шчырае задавальненьне ў вачах Васіля Уладзіміравіча – нямарна прапалі

нашыя высілкі па арганізацыі сьвята, шматлікія паездкі ў Шчучын, Астрыну, па прылеглых вёсках, на магілу Цёткі, дзе ўсё прыводзілі ў парадак, зьбівалі з дошак эстраду, устанаўлівалі лаўкі і ларкі... Нават тое, што ў тыя часы толькі на Гарадзеншчыне дарожныя знакі, назвы населеных пунктаў выконваліся па-беларуску, быў вынік і нашых з ім паездак, і частых прыездаў да нас менскіх пісьменьнікаў. (...)

Калі воляю лёсу мы з Быкавым аказаліся суседзямі, то ў яго адпала ўсялякая патрэба званіць мне на работу, сустракаць на шляху з работы, калі спатрэбіцца нешта абгаварыць. Званіў вечарком дадому, падымаўся да мяне ці я спускаўся двумя паверхамі ніжэй да яго альбо дамаўляліся пагуляць па старажытных вузкіх вулічках – ён вельмі любіў і гэтыя вулічкі, і вячэрнія прагулкі па іх. Колькі гаворана-перагаворана пад час гэтых прагулак па амаль бязлюдных старых вулічках! Многае забылася, многае прыпамінаецца зусім сьвежа, з усімі характэрнымі інтанацыямі ягонага голасу. Я ніколі не запісваў, ня вёў ніякіх дзёньнікаў – і, што тычыцца стасункаў з Быкавым, ня надта шкадую, бо ўсё гэта было б ня надта вялікім адкрыцьцём, ня надта значным дадаткам да таго, чым ён жыў, якія жыцьцёвыя, маральныя, палітычныя, літаратурна-эстэтычныя праблемы яго хвалявалі: усё гэта ёсьць у ягоных мастацкіх творах, грунтоўнай публіцыстыцы, якая дзякаваць Богу выдадзеная ў некалькіх кніжках, і нарэшце – у ягонай мемуарнай кнізе.

Васіль Уладзіміравіч ніколі не гаварыў, над чым канктэтна працуе, баючыся сурочыць. У нейкай меры ён быў не свабодны ад пэўных сялянскіх прымхаў і забабонаў. А што тычыцца рэлігіі – ня быў ні пасьлядоўным прыхільнікам нейкай адной канфесіі, ні заўзятым вернікам, ні актыўным атэістам – Бог жыў у ягонай душы. З ім іншы раз рабіліся незразумелыя, сапраўды нейкія містычныя рэчы. Прыгадаю ўсяго адну, злавесны сэнс якой высьветліўся толькі пасьля... Васіль Уладзіміравіч ня раз расказваў: амаль заўсёды, едучы за рулём на Вушачы ці з Вушачаў, ля Бараўлянаў з ягонай машынай нешта здаралася – ці матор пойдзе ўразнос, бы нейкая нячыстая сіла раптам пасялілася ў карбюратары, ці наадварот – глухне і ні з месца. Варта адбуксіраваць з кіламетр – і ўсё ў парадку. Ён меркаваў, што ля Бараўлянаў з ім нешта мусіць здарыцца – магчыма якая аўтаварыя... Мо гэта яму падаваў сігнал ягоны знак бяды – хто ведае, бо менавіта ў Бараўлянах закончыўся ягоны жыцьцёвы шлях...

Але пра некаторыя свае планы і задумы Васіль Уладзіміравіч гаварыў ахвотна. Многія з іх ён рэалізаваў, іншыя так і засталіся задумамі. Ён неяк казаў мне, што ўсе гэтыя гады пасьля вайны яго глыжэ маральны абавязак напісаць страшную рэч, у цэнтры якой коні на вайне: чалавек можа схавацца, закапацца ў зямлю, а яны з паадрыванымі нагамі, вывернутымі кішкамі з жахам і дакорам у вачах не адпускаюць ягоную памяць, як кашмары. Не пасьпеў. Ён яшчэ ў Гродне зьбіраўся напісаць аповесьць на сучасную экалагічную тэму, але яна яму ніяк не давалася – чэпка трымала ваенная тэма. Ён прапанаваў мне распрацаваны сюжэт і герояў, запэўніваў, што ў мяне атрымаецца. Я не сьпяшаўся брацца, упэўнены, што рана ці позна, а ён, калі можна так сказаць, выдыхнецца на тэме, адыйдзе ад вайны, сам напіша. Ён адчуваў, ужо тады рабіў крокі, каб трохі адыйсьці ад вайны, але завязваліся ўсё новыя і новыя вузельчыкі, разьвязаць якія ніхто, апроч яго, Быкава, ня мог...

Думаю, варта сказаць пра гарадзенскія кватэры Васіля Быкава, асабліва пра апошнюю, пра якую і вусна, і ў друку нагаворана шмат рознага глупства кшталту: то быццам Быкаў не хацеў яе атрымліваць, яго ледзь ці ня сілком усялілі, каб узяць на кручок, зрабіць ручным і паслухмяным, то – наадварот, нібыта распанеў, прадаўся за шыкоўныя пакоі і г.д.. Гэтая лухта ня вартая была б і выпісанай з ручкі пасты, калі б гісторыя з апошняй гарадзенскай кватэрай Быкава не была

павучальнай у сэнсе стаўленьня ўладаў да людзей, што зьяўляюцца гонарам нацыі. Я добра ведаю, што задумвалася і што адбылося з гэтым элітным домам. А задумвалася пабудаваць яго і пасяліць тут усё абласное кіраўніцтва, як гэта здавён рабілі ў Маскве. Праектную дакументацыю здабылі ў Зорным гарадку, дзе на той час было некалькі такіх дамоў для касманаўтаў. “Пасадзілі” касьмічны дом на амаль тупіковай вуліцы Парыжскай камуны ў гістарычным цэнтры, сярод старых прысадаў, на самай высокай у горадзе маляўнічай кручы Нёмана. То было нават па сёньняшніх мерках раскошнае жытло: чатырохпакаёўка – 125 квадратных метраў, ізаляваныя пакоі разьмешчаныя так, што ўвесь дзень не хаваецца сонца, і кожны мае выхад на сваю аўтаномную вялізную лоджыю і г.д. і да т.п., як два туалеты, васемнаццаціквадратнаметровая кухня, на сем квадратаў ванны пакой, агромісты калідор са складной сьценкай у залу – можна любую ўрачыстасьць на персонаў сто спраўляць, убудаваныя ў сьцены шафы і шкапчыкі, нават для вудаў прадугледжана месца. Такога ў Гродне ніхто яшчэ ня бачыў і, натуральна сярод начальніцкага люду ўсчаўся вялікі ажыятаж і за тое, каб патрапіць у сьпіс абраных, і за прэстыжныя паверхі. Аднак, як толькі змрачнаватая на выгляд дзевяціпавярховая няўклюдная аграмадзіна на 24 кватэры, якую мясцовыя дасьціпнікі тут жа празвалі бункерам, кідка ўпісалася ў гарадскі ланшафт і была падрыхтавана да засяленьня, першы сакратар абкаму Кляцкоў перадумаў сам засяляцца і загадаў: паказаць усе кватэры Быкаву, якую выбера – выпісаць ордэр. А незамужнюю Вольгу Корбут усяліць у трохпакаёўку. Астатнія – аддаць тым кіруючым работнікам, хто мае рэальную патрэбу ў паляпшэньні жылёва-бытавых умоў.

Васіль Уладзіміравіч выбраў чатырохпакаёўку на чацьвёртым паверсе, мне дасталася такая ж двумя паверхамі вышэй. Дакладна ведаю, што кватэру ён ні ў кога не прасіў, заяву напісаў для праформы заднім чыслом па просьбе гаспадарнікаў, калі ордэр на засяленьне і ключы ад кватэры былі ў ягонай кішэні. Ён быў рады атрымаць прасторнае жыльлё, і перш за ўсё таму, што рашаліся ўсе праблемы з ягонай вялізнай бібліятэкай, бо невялічкая кватэра па вуліцы Сьвярдлова ўжо стала нагадваць кніжны склад. І канечне ж, хто ня хоча пажыць па-людску, калі ёсьць такая магчымасьць і калі па вялікім рахунку ты гэта заслужыў? Будаўнічыя недаробкі былі звычайнай і натуральнай зьявай, нават на абкамаўскіх аб’ектах. Гэта сёньня, маючы грошы, можна наняць любую рамонтна-будаўнічую брыгаду, якая зробіць хутка і якасна ўсё, што твая душа пажадае. Грошы ў Быкава тады былі, але не было будматэрыялаў і людзей, якія ўзяліся б усё зрабіць па-людску. Даводзілася даводзіць да ладу сваімі рукамі – бегаць па магазінах, даставаць фарбы, лак, клей, нават крэйду і замазку. Як знаёмыя і блізкія суседзі мы па колькі разоў на дні сыходзіліся, раіліся, кааперыраваліся. Засьведчу толькі, што абсталёўваў сваё новае жытло ён з любоўю, вялікім імпэтам, разважлівай сялянскай самавітасьцю. У адрозгненьне ад сваёй гарадзенскай дачы, якую цярпець ня мог. Ды і да менскай, здаецца, ня меў вялікай любові...

Але не наканавана было яму пажыць-парадавацца ў тых шыкоўных апартаментах (як і мне таксама) – праз нейкіх пару гадоў мы адзін за адным па розных прычынах зьехалі ў Менск. І ўвогуле гэтая кватэра для ягонай сям’і аказалася нешчасьлівай. Сын Васіль знайшоў сваю палавінку зусім побач – злюбіліся-пажаніліся з дачкой генерала, што жыла ў суседняй трохпакаёўцы. Толькі сышліся, як наваліліся беды – адно за другім сталі паміраць маці, цесьць, цешча. Спрытныя чыноўнікі палічылі, што дзьве кватэры для маладой сям’і гэта ўжо занадта, праўдамі-няпраўдамі выжылі з абодвух у дом па Сьвярдлова, дзе раней жыў Быкаў, прыхапіўшы шыкоўныя кватэры сабе.

У людзей, хто мала ведаў Васіля Уладзіміравіча, меркаваў пра ягоную асобу па фотакартках, відэазапісах, складвалася ўражаньне, што пісьменьнік быў заўсёды строгі, сур’ёзны, пануры, пахмурны, нават злы. Нейк здаралася, што не апы-

налася побач добрых фатографаў, калі Быкаў быў у гуморы, вясёлы, лагодны, сыпаў жартамі, расказваў розныя сьмешныя гісторыі і здарэньні, у якія трапляў сам ці нехта з блізкіх знаёмых. Асабліва – Карпюк, якога пры ягоным экстравагантным характары заўсёды падпільноўвалі розныя камічныя сітуацыі. Некалькі гэткіх карпюкоўскіх гісторыяў – як той пісаў ліст маршалу Жукаву, езьдзіў у Маскву да генерала Гарбатава ствараць таварыства цвярозасьці, насіў здаваць знойдзеныя карабіны – Васіль Уладзіміравіч уключыў у “Доўгую дарогу дадому”, але пададзеныя ў іншым жанры, яны гучаць тут даволі прэсна ў параўнаньні з тым, як ён вусна апавядаў гэтыя і іншыя шматлікія карпюкоўскія гісторыі. Карпюк ведаў, што Быкаў расказвае пра ягоныя прыгоды, але ніколі не крыўдзіўся, нават быў задаволены, часам нешта ўдакладняў на поўным сур’ёзе – і тое было яшчэ сьмяшнейшым. Шкада, што нікому ў галаву не прыйшло запісаць гэтыя аповяды на магнітафонную стужку – была б арыгінальная, вельмі сьмешная кніжка, мо яшчэ сьмяшнейшая, чым знакаміты ананімны лысагорскі сказ. Памятаю, неяк па дарозе на Воранава, куды мы ехалі з мінскімі гасьцямі, зайшла гаворка пра набыцьцё машынаў і Васіль Уладзіміравіч пачаў расказваць, як Карпюк абзаводзіўся асабістым транспартам – спачатку “Масквічом”, потым веласіпедам, каб быць падобным на Льва Талстога. Мы ўсе аж поўзалі ад сьмеху, а вадзіцель спыніў машыну: “Не магу-у...” А калі трохі суняліся, Быкаў пачаў у тым жа тоне апавядаць пра свае шафёрскія прыгоды – ён толькі што атрымаў правы і аб’язджаў купленага “Жыгуля”. Асаблівыя праблемы ў яго былі з левым паваротам: як ўжо ні стараецца, а матор, як на злосьць, як на якое ліха глухне ўпоперак дарогі, перагарадзіўшы рух. Утвараецца затор, вадзіцелі грузавікоў крыюць мацюкамі, махаюць кулакамі, сёй-той нецярплівы выскоквае з манціроўкай. І падаваў пра свае шафёрскія прыгоды-нягоды з гэтакім гумарам, што каб і хацеў утрымацца ад сьмеху – не зможаш. Як і пра тое, як яго грузіны раз і назаўсёды яго ад радыкуліта вылечылі, кінуўшы спаралізаванага ад болю ў сьцюдзённую рэчку, а потым адпаіўшы і расьцёршы каньяком.

Ён вельмі любіў дасьціпныя сяброўскія жарты, розыгрышы. Неяк ужо ў Менску дамовіліся збегчыся ў Генадзя Бураўкіна ў ягоных “Сівых конях” – так мы ўжарт празвалі ладную ўтульную сталоўку-бакавушку ў былой вялізнай пяціпакаёвай кватэры па вуліцы Захарава. На зьдзіўленьне Быкаў прыйшоў, калі ўсе былі ў зборы. Даруйце, хлопчыкі, кажа, прыпазьніўся – у чарзе прастаяў, новую ж гарэлку выпусьцілі. З найвялікшай цікаўнасьцю чакалі, пакуль ён нясьпешна адчыняў партфель, вымаў пляшку з раскошнай каляровай этыкеткай. Во, палюбуйцеся, кажа, пляшку з рук не выпускае, толькі каб бачылі назву. Недаўменна лыпаем вачамі – “Сівыя коні”!? Пляшка пайшла па руках – на этыкетцы пад назваю драбнейшым шрыфтам: “вушацкая самаробная” і на медалях, як у “Сталічнай” – у кружочкі акуратна ўклееныя нашы фізіяноміі, ягоная – таксама... Гэта быў вышэйшы пілатаж. Канечне ж, не адну гадзіну патраціў мастак Быкаў на выраб дасьціпнай этыкеткі, каб парадаваць сяброў вясёлым жартам.

Ну і яшчэ адна амаль неверагодная вясёлая гісторыя, як мы “адпомсьцілі” Карпюку – у літаральным сэнсе напаілі найвялікшага і найпрынцыповейшага цвярозьніка. Было гэта на Днях украінскай культуры ў Беларусі, ў рамках якіх да нас на Гарадзеншчыну прыехала вялікая група украінскіх і беларускіх дзеячоў культуры – пісьменьнікаў, кампазітараў, артыстаў. Карпюк яшчэ не выйшаў з апалы ў сувязі з выключэньнем з партыі і Васіль Уладзіміравіч прапанаваў: давай возьмем яго з сабой – то будзе для яго вялікай маральнай падтрымкай. Дамовіліся, што я нічога ня буду казаць начальству, бо не дазволяць, а ён пагаворыць з Карпюком, каб той ня надта высоўваўся. Выступалі ў Мастоўскім раёне. Усё ішло як мае быць, а вечарам наладзілі пачостку па вышэйшым класе пад дубамі на беразе Нёмана. Сталы ломяцца ад адборнай закусі і пітва на любы густ, на кастры варыцца архірэйская юшка. Надвор’е – як па заказу, цёплае і ні камарыка, цішыня такая,

што чутно, як плёскаюцца рыбы ў Нёмане ды патрэскваюць кастры. Настрой ва ўсіх мінорны, у перапынку хорам зацягнулі “Ой, бярозы ды сосны”, тут жа аўтар Уладзімір Уладзіміравіч Алоўнікаў, расчулены, хоць намагаецца хаваць гэта. Няймецца толькі Карпюку – затэрарызаваў Быкава, а затым і мяне: паехалі дадому, досыць гэтай п’янкі.

– Давай яго напоім, – па змоўніцку прапанаваў Быкаў. – Ты яго пахвалі і дай слова пасьля перапынку, а я яму ў фужэр набухаю...

Карпюк сядзеў з краю, сярод бандурыстак, падтрымліваў тосты фужэрам вады. Васіль Уладзіміравіч падміргнуў: усё зроблена. Звычайна на пачостках рэй вядзе гаспадар, але паколькі мастоўскі першы мала каго з гасьцей ведаў, не настолькі валодаў беларускай мовай, каб на ёй весьці рэй, а сам адчуваў, што па-руску ў такой сітуацыі не зусім будзе правільна, упрасіў кіраваць парадам мяне, як прадстаўніка абкама...

Гаспадынькі ў нацыянальных касьцюмах абвясьцілі, што перапынак закончыўся, паклікалі ўсіх за стол, дзе паставілі міскі з пахучай юшкай. Я падняўся і пачаў прачула, унёсла нешта кшталту: во толькі што мы прасьпявалі цудоўную партызанскую песню Алоўнікава, а тут, сярод нас прысутнічае чалавек, які ў гады вайны са зброяй у руках бараніў гэтыя мясьціны – камандзір партызанскага атраду, а зараз выдатны беларускі пісьменьнік Аляксей Нічыпаравіч Карпюк. Я прадастаўляю яму слова і прапаную выпіць за тост Аляксея Нічыпаравіча стоячы і па партызанскай звычцы да дна...

Карпюк так расчуліўся, так разгубіўся, што стоячы, з ледзь ці не поўным бакалам знайшоўся сказаць усяго толькі: “За вас і да дна!” – і двумя глыткамі хлыбуснуў “ваду”. Ад узрушэньня ён, здаецца, адразу і не зразумеў, што глытнуу, толькі, сеўшы на месца, злосна бліскаў вачыма на суседак зьлева і справа. Мы пераглядваліся з Быкавым і аж кісьлі ад сьмеху. Неўзабаве, па ўсім відно было, яго пачало разьбіраць – расчырванеўся, завёў ажыўленую, сьмяшлівую гамонку з суседкамі, а калі і насамрэч настаў час ехаць, заўпарціўся: яшчэ рана, гуляем!

– Аляксей, ты што, ўзяў!? – “зьдзівіўся” Быкаў. – Згубіў сваю антыалкагольную цноту?

– Ат, думаеш, толькі табе можна! – агрызнуўся незласьліва Карпюк. – Дзеўкі, сучкі, наплюхалі ў фужэр, а я, не разабраўшы, глыкнуў...

Васіль Уладзіміравіч, як і я, упершыню бачыў Карпюка такім. І ў гэтым нязвыклым стане той быў вельмі харошы і вясёлы – аж да самага Гродна даводзіў нас да колікаў яўрэйскімі анекдотамі, якіх, аказваецца, ведаў процьму, але я ніколі ня чуў, каб расказваў. Гэта быў першы і апошні выпадак, калі ўдалося ашукаць яго – апёкшыся аднойчы, ён перш, чым выпіць свой фужэр з вадою, заўсёды вынюхваў яго, спрабаваў на язык, нават калі сам адкаркоўваў і наліваў з бутэлькі. А мы былі адзінымі ў Гродне, хто бачыў вялікага цьвярозьніка на падпітку...

Але ад вясёлага – да самага сумнага... Як сёньня памятаю, Васіль Уладзіміравіч пазваніў мне 26 мая 2003 году і цяжкім голасам, куды цяжэйшым, чым зусім нядаўна гаварыў з Прагі, сказаў, што прыехаў дадому, трэба зьбегчыся, чакае ўсіх нас траіх (Генадзя Бураўкіна, Сяргея Законьнікава і мяне) заўтра, у шэсьць вечару. Сказаў, што Сяргею пазваніў ужо, ня можа дазваніцца да Генадзя, прасіў нейкім чынам паведаміць яму. Я сказаў, што той ледзь ці не бязвылазна асеў на дачы, тым ня менш абавязкова забясьпечу ягоную яўку.

– Добра, то заўтра і пагаворым, – тым жа цяжкім астматычным голасам сказаў Васіль Уладзіміравіч і паклаў трубку.

З часоў, як ён перабраўся з Гродні ў Менск, узьнікла завядзёнка зьбірацца ў Быкава і з нагоды нейкіх важных і ня надта важных для яго падзеяў, і проста без усялякай нагоды, калі ўзьнікала патрэба пагаманіць-пабачыцца. Амаль заўсёды ініцыятарам выступаў сам Васіль Уладзіміравіч, асабліва калі вяртаўся з нейкіх замежных вандровак ці, як у апошнія гады, наведваўся дадому з Фінляндыі, Гер-

маніі, Чэхіі, дзе вымушаны быў жыць практычна ў выгнаньні. Абзвоньваў і прызначаў час сустрэчы. Раней, калі Генадзь Бураўкін меў “Сівыя коні”, яўку часам прызначалі там ці яшчэ ў некага, але часьцей за ўсё сустракаліся ў гасьціннай і ўтульнай хаце Васіля Уладзіміравіча, дзе шчыравала, як магла, са смачнымі закускамі дабрэйшая Ірына Міхайлаўна. На гэтых “зьбяганках” звычайна бывалі Ніл Гілевіч, пакуль яны, на нашае агульнае засмучэньне, не разышліся з Васілём Уладзіміравічам, калі былі жывыя – Мікалай Матукоўскі, Алесь Адамовіч, зрэдку Уладзімір Караткевіч, ну і нашая тройца. Нейкі час, але нядоўга бываў Анатоль Сульянаў. Не хачу сказаць, што толькі пералічаныя людзі былі адзінымі і найбліжэйшымі ягонымі сябрамі. Мо бліжэй за ўсіх яму быў Рыгор Барадулін і як чалавек, і як непераўзыйдзены майстар паэтычнага слова, да якога ён ставіўся амаль пяшчотна, называў беларускім салоўкам. Аднак Васіль Уладзіміравіч быў чалавек мудры, ня мог ня ўлічваць ну... псіхалагічную несумяшчальнасьць некаторых блізкіх яму людзей. Вельмі прыязныя пачуцьці меў ён да Валянціна Тараса, Анатоля Вярцінскага, Анатоля Кудраўца, Алеся Жука, Віктара Казько, Дзьмітрыя Бугаёва і шмат каго яшчэ. У яго былі сотні, тысячы людзей, да якіх ставіўся шчыра, пасяброўску, прыязна і тут, на Беларусі, і ў Расіі, і на Украіне, і ў Літве, і ў Балгарыі – каб і хацеў усіх не пералічыш. Як і каля кожнага вялікага чалавека, ля яго круцілася, ліпла слатою, набівалася ў сябры-паплечнікі і розная шушара, ад адной згадкі пра шмат каго з гэтых самазванных сяброў-паплечнікаў Васіль Уладзіміравіч ажно моршчыўся... Кіруючая холдзінгавая дама надрукавала ў сваёй газетцы ў жалобныя дні свой фотаздымак побач з Быкавым (ведай нашых!), зроблены недзе у кулуарах пісьменьніцкага зьезду, але разьвітальнае слова пра Быкава, падпісанае вялікай групай слынных беларускіх пісьменьнікаў, друкаваць адмовілася. Другая літаратурная дама пасьля таго, як Быкаў начытаў старонкі сваёй кнігі ўспамінаў на радыёстанцыі “Свабода”, вырашыла не адставаць, высунулася туды ж са сваімі “мемуарамі”, дзе падала сябе ледзь ці не павівальнай бабкай беларускай дэмакратыі, ледзь ці не душапрыказчыцай Быкава яшчэ з “гарадзенскіх” часоў. Але, як кажуць, Бог ім суддзя...

Толькі, здаецца, аднойчы была парушаная традыцыя зьбегчыся ў Быкава сваёй звыклай кампаніяй. Гэта было ў ягоны папярэдні прыезд з Прагі – вясною 2002 году. Нешта тады не атрымалася – нездаровілася Ірыне Міхайлаўне і падціскаў час з ад’ездам, таму сабраліся ў “халасьцяцкай” на той дзень кватэры Валянціна Тараса, дзе апроч нас траіх, былі Рыгор Барадулін і Міхась Тычына. Васіль Уладзіміравіч быў нейкі заклапочаны, засяроджаны, нязвыкла маўклівы. Нягледзячы на ўсе намаганьні Генадзя і Рыгора, шчырая, з жартамі і пацьвелкамі гамонка, якой яна бывала амаль заўсёды, не клеілася. Выйшлі завідна. Ладны кавалак дарогі па вуліцы Багдановіча ішлі гуртам па нешырокім ходніку. Загаварылі “сепаратна” з Васілём Уладзіміравічам, трошкі адстаўшы ад кампаніі. Ён сказаў тое, чаго мы ўсе трое ад яго даўно чакалі: “Рашыў вяртацца дадому. Во паеду, уладжу там сякія-такія фармальнасьці – і вяртаюся”. І ў ранейшыя свае прыезды ён заводзіў гаворку аб непазьбежным вяртаньні, але гаварыў неяк няпэўна, у гепатэтычным плане, бы толькі для таго, каб ведаць на гэты конт нашую думку. Ён нудзіўся ў эміграцыі, адчуваў там сваю непатрэбнасьць, унімаў настальгію штодзённай катаржнай працай – і над чыстым аркушам паперы, і за кампутарам, які асвоіў на старасьці год. Пра ягоную напружаную працу сьведчыць багаты плён – добрых два тамы мастацкай прозы, дзе і такі знаёмы, і незнаёмы, зусім новы Быкаў, які чакае яшчэ свайго дасьледчыка. Безумоўна, тут, на Радзіме, ён гэтага ня зьдзейсьніў бы. І ён гэта адчуваў, і мы гэта ведалі. З аднаго боку – вымотвала б нервы, псавала настрой, забірала б душэўныя сілы дурная, бязмозгая, нечуваная па нахабнасьці кампанія па шальмаваньню яго, Народнага, Героя, Лаўрэата, сусьветна вядомага пісьменьніка, што ўсчалася ў дзяржаўных сродках масавай інфар-

мацыі. Па почырку адчувалася рука таго ж рэжысёра і сцэнарыста, які яшчэ ў шасьцідзесятыя гады рабіў кар'еру на цкаваньні маладога Быкава, затым разьдзімаў кадзіла пагромніцкай антыбыкаўскай кампаніі ў Маскве. Кампанія пацярпела фіяска, але кар'ера на Старой плошчы зробленая была, і ён усё жыцьцё, колькі мог і як толькі мог, паскудзіў Быкаву. Што ж, герастратава слава для людзей такога кшталту – таксама слава. Калі састарэламу адыёзнаму "паліттэхнолагу" адусюль у Маскве далі высьпятка, ён пераехаў у Менск і быў запатрабаваны ў самых высокіх кіруючых сферах. І з другога боку – не давала б ні спакою, ні магчымасьці засяродзіцца на творчасьці розная назойлівая, нахрапістая калялітаратурная, але перш за ўсё – каляпалітычная шалупонь, якой патрэбна было імя Быкава, ягоны аўтарытэт і сусьветная вядомасьць, і злоўжываючы мяккасьцю характару, інтэлігентнасьцю і далікатнасьцю натуры пісьменьніка, яна не жадала лічыцца ні з ягонай занятасьцю, ні з ягоным здароўем...

Той раз ён гаварыў аб сваім вяртаньні дадому як справе для сябе вырашанай канчаткова і беспаваротна. За доўгія гады я ня раз назіраў Быкава, калі ён прымаў прынцыпова важныя для сябе рашэньні – тут ніхто ня мог яго ні ўгаварыць, ні пераканаць, і мяне, як і ўсіх, хто яго добра ведаў, заўсёды зьдзіўляла, як ужываецца ў ім мяккасьць, далікатнасьць, немагчымасьць некаму адмовіць з непахіснай цьвёрдасьцю, рашучасьцю, бескампраміснасьцю, калі справа тычылася ягонага перакана      ньня, ягоных прынцыпаў. Пачуўшы маё, вядомае яму і раней, станоўчае стаўленьне, якое, канечне ж, ужо не магло мець абсалютна ніякага значэньня, ён патлумачыў:

– Быў сэнс заставацца там, пакуль пісалася. Усё, што планаваў – зрабіў. Зараз, так сказаць, трэба пабыць дома, а там відно будзе...

Генадзь Бураўкін расказваў, што прыкладна тое ж Быкаў казаў і яму.

Мы чакалі ягонага вяртаньня летам. Ня ведаю, што ўтрымала яго. Магчыма, гэта быў кампраміс з блізкімі яму людзьмі, якія не падзялялі ягоны намер – хоць і цяжка было на яго ўзьдзейнічаць, але ён быў жывы чалавек. Магчыма, з-за здароўя, якое пагаршалася і пагаршалася і ўрэшце рэшт закончылася страшным дыягназам... Аперыраваць узяліся ў пражскім шпіталі – тым самым, тыя ж урачы, што рабілі складаную анкалагічную аперацыю прэзідэнту Гавелу...

Ягоны апошні прыезд быў даволі нечаканым і нечаканым, хоць па-праўдзе кажучы, усе ягоныя прыезды апошнія гады былі нечаканымі – ведалі, што павінен прыехаць, але што ён ужо дома, даведваліся з ягоных званкоў. Як і ніхто толкам ня ведаў, у які час, якім відам транспарту ён адбывае. Упадаў у гэтую канспірацыю Васіль Уладзіміравіч не таму, што хацеў абвесьці вакол пальца адпаведныя службы – не такі наіўны ён быў чалавек, каб ня ведаць, што не пасьпее пераступіць дзяржаўную мяжу, як тыя, каго гэта цікавіць, маюць інфармацыю. Не хацеў іншай праінфармаванасьці, пасьля якой на вакзале альбо ў аэрапорце яго сустрэне ці прыдзе праводзіць натоўп ды яшчэ са сьцягамі, плакатамі, чаго ён арганічна не выносіў. Расказваў, неяк выйшаў з ліфта на лесьвічную пляцоўку з чамаданамі – а там ужо людзі, якіх менш за ўсё хацелася б бачыць. Звычайна ён адключаў тэлефон, сам званіў, каго хацеў пачуць ці пабачыць. Цяперашні ягоны прыезд нечаканым быў у тым сэнсе, што пасьля аперацыі ён знаходзіўся пад пільным наглядам урачоў. Генадзь Бураўкін толькі-толькі сабраўся ехаць у Прагу праведаць яго, заадно ўзяць інтэрв'ю для газеты "Салідарнасьць", на якое па тэлефоне згадзіўся Васіль Уладзіміравіч, хаця к таму часу катэгарычна адмаўляўся даваць якія б там ні было і каму б там ні было інтэрв'ю...

Даволі хутка ўдалося зьвязацца з Генадзем праз ягонага сына Лёшу, і назаўтра з ранку ён пазваніў мне з кватэры. Перагаварылі, дамовіліся, як паедзем, дзе і ў колькі сустрэнемся, і ледзь паклаў трубку і сабраўся набраць нумар Сяргея Законьнікава, як зноў званок ад Генадзя – толькі што Быкаў званіў яму, прасіў перанесьці сустрэчу на заўтрашнюю раніцу, на дзесяць гадзінаў...

Васіль Уладзіміравіч быў рэдкі на цяперашні час чалавек слова, да педантычнасьці дакладны і абавязковы. Калі скажа, што прыдзе – можна не сумнявацца:

будзе з дакладнасьцю да хвіліны, прызначыць сустрэчу – практычна ніколі не бывала, каб адмяніў. Мы зразумелі, што яму кепска, к вечару, пэўна, вельмі стамляецца і ня хоча паказвацца такім перад намі...

Ён, як заўсёды, сам адчыніў дзьверы, сустрэў нас характэрнай шчырай і прыязнай быкаўскай усьмешкай са звычайным радасным воклічам: "Ну, во-о-о, хлопчыкі!" Абняліся-расцалаваліся ў вузкім калідорчыку і, пакуль Ірына Міхайлаўна накрывала стол у зале, запрасіў у кабінет у канцы калідорчыка направа. Тут спакойным, нават трошкі іранічным голасам расказваў і пра "рачка, што завёўся" ў ім, і пра тое, як пагана адчуваеш сябе з урачамі, ня ведаючы тамтэйшай мовы, і пра свой няпросты пералёт з Прагі ў Менск, за час якога ён ды і Ірына Міхайлаўна гублялі прытомнасьць.

Гутарку прадоўжылі ў зале, заняўшы "свае" месцы – ён з Генадзем на канапе справа, мы з Сяргеем насупраць на крэслах. Ірына Міхайлаўна, як заўсёды, прысела на хвілінку на нізенькі зэдлік у тарэц стала, нешта пыталася, але, як і звычайна, ня надта ўмешвалася ў нашу мужчынскую гамонку: пасядзіць – і зноў бяжыць шчыраваць на кухню. Васіль Уладзіміравіч засыпаў нас пытаньнямі – і пра здароўе, і пра нашых сямейнікаў, і пра літаратурныя справы, а больш за ўсё – што робіцца тут, на Беларусі, як тут зблізку мы бачым і разумеем розныя падзеі апошняга часу. Ён выслухоўваў нас і меў свае меркаваньні. Лёс роднай Беларусі заўсёды востра хваляваў і трывожыў яго, нават цяпер, зьняможанага, спакутванага сьмяртэльнай хваробай.

Фізічныя дый, вядома, душэўныя пакуты, немаладыя гады зьнешне зрабілі з яго зусім старога, на той дзень амаль што нямоглага чалавека, што адразу ж кінулася ў вочы. Ён страшна здаў у параўнаньні з тым, якім быў год назад. І ўвогуле ў эміграцыі ён здаў неяк рэзка, абрывіста, асабліва калі памяняў звыклую быкаўскую прычоску "набок", з якой глядзеўся маладзейшым. А ўвогуле ён заўсёды выглядаў значна маладзейшым на свае гады. Калісь мне, васемнаццацігадоваму, калі ўпершыню ўбачыў Быкава ў сакратарыяце "Гродненской правды", ён падаўся ледзь не равесьнікам. Дый потым ягоныя аднагодкі старыліся куды хутчэй, чым Быкаў. А зараз ён быў зусім стары, стомлены, змучаны страшнай хворобай чалавек. Але трымаўся малайцом, нават чарачку прыгубіў за кампанію са мной, пацьвельваючыся з Генадзевага і Сяргеевага цьвярозага ладу жыцьця, да якога ніяк ня мог прывыкнуць дый прыняць усур'ёз таксама, хоць сам ужо добрых гадоў з дзесяць не браў нічога, апроч чарачкі сухога віна...

Гадзіны праз тры мы заўважылі, што ён стаміўся, і сталі сьпешна зьбірацца. Ён у адрозьненьне, як гэта бывала заўсёды, на гэты раз не настойваў пабыць яшчэ, выпіць "на дарожку", не хаваў, што яму хочацца прылегчы, хоць ні словам не абмовіўся пра сваю немач. Ён ніколі не любіў скардзіцца на свае болькі і нягоды, якіх аж занадта хапала ў ягоным, як многім здавалася, надта ж удалым і шчасьлівым лёсе. На разьвітаньне Васіль Уладзіміравіч падарыў кожнаму з нас сваю "Доўгую дарогу дадому" са зробленымі яшчэ да нашага прыходу подпісамі-аўтографамі і абавязковыя для яго памятныя сувенірчыкі, якія заўсёды прывозіў з замежных вандровак. У гэтым сэнсе ягоная ўважлівасьць была проста ўнікальнай. Не памятаю, каб ён калі забыўся павіншаваць з днём нараджэньня ці нейкай іншай сямейнай урачастасьцю, нават знаходзячыся за тысячы кіламетраў. Нягледзячы на рашучыя пярэчаньні, Васіль Уладзіміравіч, як тое бывала заўсёды, пайшоў праводзіць нас да самага ліфта...

Гэта было наша апошняе "зьбяганьне" ў Быкава з Быкавым. Але не апошняя сустрэча з Васілём Уладзіміравічам. Апошняя адбылася праз няпоўны месяц – 19 чэрвеня, у 79-тыя ўгодкі ягоных народзінаў, якія ён сустракаў у бальнічнай палаце ў Бараўлянах. Мы згаварыліся з Барадуліным, Кудраўцом, Вярцінскім ехаць разам вялікай групай, каб меней стамляць Васіля Уладзіміравіча. Ён ужо не падымаўся, хоць ўрачы, што лячылі яго, былі на той момант настроены вельмі аптымістычна. Урач забараніла заносіць у палату кветкі – яны выклікалі ў Васіля Уладзіміравіча прыступы астмы, якая мучыла яго не адно дзесяцігоддзе. Шматлікія букеты, пры-

несеныя некім да нашага прыходу, стаялі і ляжалі на стале ў калідоры. Дабавілі да іх свае і запоўнілі палату. Павіншавалі, узялі нават, стоячы, па кілішачку за ягоны дзень анёла і – галоўнае за здароўе. Васіль Уладзіміравіч спрабаваў усьміхацца, але і ўсьмешка, і словы даваліся яму цяжка. Выслухаў аўдыёпасланьне ад Рыгора Бакланава, якое прынёс і ўключыў па прыёмніку Рыгор Барадулін, і ўрач нагадала, што хвораму трэба адпачыць...

Праз тры дні вялікі пісьменьнік і грамадзянін, народны ня толькі па званьні, але і па існасьці, аб чым як нельга лепш засьведчылі ягоныя сапраўды ўсенародная праводзіны, спачыў назаўсёды...

Улады больш за ўсё непакоіла, каб на разьвітаньні і ў Саюзе пісьменьнікаў, дзе была ўстаноўленая труна з целам нябожчыка, і на вуліцах, і на Усходніх могілках не зьявіліся бел-чырвона-белыя колеры. Аднак на разьвітаньні з самым знакамітым Беларусам яны проста не маглі не зьявіцца. І калі, выконваючы волю нябожчыка, на труне Васіля Уладзіміравіча зьявілася нацыянальнае бел-чырвона-белае палотнішча, урадавая камісія на чале з міністрам культуры Гулякам панічна зьбегла. Можна толькі дзіву давацца, але сёй-той у нас стаў шарахацца ад гістарычных нацыянальных колераў, як чорт ад крыжа ці ладана, неўспрымаць іх ледзь ні на астральна-ірацыянальным узроўні...

Бог ім суддзя, але ніхто з кіраўнікоў, афіцыйных асобаў, апроч групы дэпутатаў, сярод якіх былі і Машэрава, Малафееў, ці то не палічыў патрэбным разьвітацца з народным пісьменьнікам, ці то збаяўся наблізіцца да небясьпечных колераў. Прыйшоў народ. Такога, бадай, пасьля пахаваньня Машэрава ў Менску яшчэ не было. Дзесяткі тысячаў людзей прайшлі ў жалобным маўчаньні ля труны Быкава, а потым несьлі яе на руках ад плошчы Перамогі да плошчы Якуба Коласа, запрудзіўшы амаль на ўсю шырыню прасьпект Скарыны. І ў гэтым таксама была сімволіка – шлях ад абаронца Радзімы да класіка літаратуры. Там, на плошчы, чакаў катафалк і аўтобус, адзін, замест дзесяці дамоўленых, і шматтысячная працэсія пад нацыянальнымі колерамі пайшла па прасьпекце аж да Усходніх могілак. Дзякуй Богу за тое, што абразуміў некага не даваць каманды АМАПу...

Бяру з паліцы апошнюю прыжыцьцёвую кнігу Васіля Быкава... “Доўгая дарога дадому”... У чорнай вокладцы, як і чорная дата, што тады няўмольна набліжалася... Ён, фаталіст па натуры, фаталіст ва ўсёй сваёй творчасьці, ведаў, ня меў ніякіх ілюзіяў, адчуваў, што тая дата няўмольна насоўваецца, і чакаў гэтую кніжку, як ніякую іншую (мо хіба толькі некалі першую). Яна была самай асабістай, самай дакументальнай ягонай кнігай, падсумоўвала і творчае жыцьцё пісьменьніка Васіля Быкава, і зямное існаваньне Васіля Уладзіміравіча Быкава як чалавека, як асобы. Ён сам выбраў для яе чорную апратку і быў шчасьлівы, што пасьпеў патрымаць у руках, падпісаць сябрам і блізкім людзям...

Адкрываю вокладку з ягоным апошнім аўтографам. Апускаю ўсё, толькі апошнія словы – “З даўняй, гродзенскай прыязнасьцю...” Дастаю і перачытваю зробленыя ў розны час ягоныя аўтографы на падораных ім практычна ўсіх, што выходзілі па-беларуску дый па-руску ягоных кнігах, і аж зьдзівіўся: усе яны – і кароткія, і разгорнутыя, наколькі дазваляла вольная плошча фарцтытульнага ліста, зробленыя ў Менску, маюць спасылкі на “незабыўную Гародню, дзе пачыналася наша сяброўства”, “сьвятую і пакутную Гродзеншчыну, дзе напісалася амаль усё”, што ўвайшло ў ягоны чатырохтомнік, і ва ўсіх – спасылка на гарадзенскае зямляцтва. Цяжка сказаць, якім ён больш быў – вушацкім ці гарадзенскім. У рэшце рэшт гэта ня мае істотнага значэньня: ён быў Вялікім Беларусам...

*Працяг будзе*